Мікалай Бушко ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

праф. Яўген Міранавіч ☞ 8-9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2784) Год LIV | Беласток, 20 верасня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Пад знакам „Wiadomości”

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У цэнтры — Міраслаў Бяляўскі і Сільвестр Кавальскі

— Змена гадзін праграм для нацыянальных меншасцей звязана са зменай асенняй „рамоўкі”, якая мае служыць між іншым росту „слухальнасці” нашага радыё, каб прадоўжыць час калі слухаецца Радыё Беласток. Пазнейшая пара меншасных перадач больш выгадная, асабліва для людзей пражываючых у Беластоку і моладзі, якая — як ведаем з даследаванняў — слухае радыё ў пазнейшую пару, — так гаварыў „Ніве” ў сеймавых кулуарах прэзас Радыё Беласток Міраслаў Бяляўскі, тлумачыўшы тое, што перасунулі на гадзіну пазней перадачы для нацыянальных меншасцей, між іншым беларускую „Пад знакам Пагоні”.

Цяперашні прэзас Радыё Беласток выконвае гэтую функцыю ад 2006 года і — згодна з кантрактам — будзе ім да будучага года. Віцэ-прэзасам па праграмных справах з’яўляецца Барбара Баярын-Казбярук. Як здаецца, гэта якраз яна павінна браць на сябе непасрэдную адказнасць за кшталт, чарговасць і г.д. праграм Радыё Беласток (вядома, пры адабрэнні прэзаса Бяляўскага). Калі папрасілі мы яе, каб пракаментавала змены датычныя меншасных перадач, праз сакратарку заявіла: „На гэтую тэму павінен адказваць прэзас Бяляўскі”.

Да гэтай пары, ад шмат гадоў, найбольш папулярная радыёперадача беларускай меншасці „Пад знакам Пагоні” пачыналася ў 18.45, а ўвесь меншасны блок у 18.30. Цяпер „Пад знакам Пагоні” перадаецца ад панядзелку да чацвярга ў 19.45 — 20.00 (увесь меншасны блок пачынаецца ў 19.30), у пятніцу ў 19.30 — 20.00, а ў нядзелю ў 7.25 — 8.00. Значыць гэта, што ў буднія дні беларускія слухачы стануць перад выбарам: паглядзець самую папулярную інфармацыйную праграму „Wiadomości” ў першай праграме Польскага тэлебачання, або паслухаць „сваёй праграмы”. Асабліва перад такой дылемай сталі беларусы ў вёсках Беласточчыны.

— Няма цяпер манаполіі на „Wiadomości” ў першай праграме TVP. Не бачу пагрозы, што з-за „Wiadomości” людзі ў вёсках не змогуць слухаць перадач накіраваных да нацыянальных меншасцей, — пераконваў нас прэзас Бяляўскі ў Сейме, дзе таксама тлумачыўся з гэтых змен перад дэпутатамі.

Распытвалі мы ў ніжэйшай палаце парламента пана прэзаса, каму ў галаву заляцела перасоўваць гэтыя праграмы.

— Рамоўку зацвярджае ўправа, а працуе над ёй цэлая рэдакцыйная калегія.

— Значыць, хто персанальна запрапанаваў тыя змены?

— Цяжка мне ў гэтую хвіліну сказаць, чыя была гэтая ідэя. Паўтараю, рамоўка рыхтуецца калегіяльна, уключна з кіраўніком рэдакцыі нацыянальных меншасцей [Аліцыяй Петручук, якая прадстаўляе беларускае асяроддзе — М. Х.].

Дадаў:

— Мы нават задумоўваліся, ці не было б выгадней вяшчаць тыя праграмы ў яшчэ пазнейшую пару па прычыне таго, што змагаемся за шораз маладзейшага слухача. Дайшлі мы, аднак, да высновы, што маглі б страціць старэйшых слухачоў, якіх мы мелі да гэтай пары, якія жывуць па-за Беластокам, у вёсках. Вядома, што людзі там ходзяць раней спаць, нават каля 21 гадзіны, і той перанос праграмы на 22 гадзіну мог бы пазбавіць іх магчымасці іх слухаць.

Аліцыя Петручук, кіраўнік рэдакцыі меншасных праграм, сказала нам:

— Я не мела ніякага ўплыву на змену асенняй рамоўкі. Калі яны рабіліся, я была ў водпуску. Пасля вяртання мяне паставілі перад фактам. Я не хачу каментаваць гэтых змен.

Папярэднікам прэзаса Бяляўскага на гэтай пасадзе быў цэнены не толькі ў Польшчы рэпарцёр, які ў значнай ступені займаецца беларускай і праваслаўнай тэматыкай — Ян Смык. Калі мы папрасілі ў яго выказацца ў справе сапхнутых на пазнейшую пару меншасных праграм, ён сказаў, не хаваючы абурэння:

— Гэта найбольшае глупства ў маім больш за трыццацігадовым досведзе ў радыё. Я заяўляю як слухач: гэта дзеянні шкодныя для радыё і нацыянальных меншасцей. Хто ў 19.30 слухае радыё? Уся Польшча робіць іншае. Залатой традыцыяй радыё BBC, уведзенай ува ўсім свеце, з’яўляецца незмянянне гадзін радыёперадач, а атрымальнікі нашых меншасных перадач з’яўляюцца найвярнейшымі слухачамі. Цяпер на Беласточчыне беларусы будуць слухаць ужо толькі Радыё Рацыя. Таксама таму, што „Канцэрт пажаданняў” вяшчае гэтая станцыя тры гадзіны бясплатна, а ў Радыё Беласток толькі паўгадзіны ды платна.

Таксама праблему з рамоўкай Радыё Беласток маюць цяпер літоўцы. І іхнія перадачы ў час „Wiadomości”, а ў нядзелю ў 6.30 — 7.00. Ірэна Гаспяровіч, лідарка Супольнасці літоўцаў у Польшчы: „Мы вельмі незадаволены гэтым фактам. Радыё Беласток, несумненна, траціць літоўскіх слухачоў”.

У час апошняга пасяджэння сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей, ад імя старшыні Краёвай рады радыёвяшчання і тэлебачання Пётр Борань, гаворачы аб ролі меншасцей у медыях, засцярог: „Публічныя СМІ самастойна ствараюць сваю праграму. КРРіТ можа толькі рэагаваць постфактум”.

У час пасяджэння камісіі нікога з цэнтралі публічных радыё і тэлебачання не было.

У час дыскусіі дэпутат Рышард Галя адзначыў:

— Не хапае меншасцям у тэлебачанні акенца агульнакраёвага абсягу. Чым больш аб меншасцях гаворым у СМІ, тым большае для іх адабрэнне.

Дэпутат Марэк Куна:

— Гэтая сціплая колькасць гадзін можа служыць толькі фігавым лістком для нагасці публічнага тэлебачання агулам.

Дэпутаты пастулявалі, каб павялічыць час і сродкі на меншасныя праграмы (у радыё і тэлебачанні). Крытычна выказваліся аб нявыгадных для слухачоў порах педадач ва ўсёй краіне. Беластоцкі радыёматыў выклікаў дэпутат Яўген Чыквін:

— Калі перадаецца ў Радыё Беласток беларуская праграма, мой бацька якраз глядзіць „Wiadomości”, хоць бы па прычыне прагнозу надвор’я.

Падтрымаў яго дэпутат Мірон Сыч:

— Весткі ў 19.30 трактуюцца шмат кім, таксама і меншасцямі, як святасць.

Пры нагодзе, пасля пасяджэння камісіі, спыталіся мы ў прысутнага на ім Сільвестра Кавальскага, выконваючага абавязкі дырэктара аддзела TVP у Беластоку, ці фактычна прападуць паўторы нядзельнай ранішняй перадачы „Беларускі тыдзень”, якая ў канікулы паўтаралася ў серады пад вечар. Заявіў ён:

— Гэтыя паўторы былі чымсьці дадатковым, што мела быць паклонам у бок меншасці. Цяпер мы працуем над новай рамоўкай і калі знойдзецца для гэтага месца, пастараемся, каб яны засталіся. Сёння, аднак, я не хацеў бы гэтага абяцаць.

Пад лістом выконваючаму абавязкі дырэктара TVB з заклікам захавання беларускіх „паўтораў” падпісалася ўжо некалькі беларускіх арганізацый. Да беларуска-медыйнай справы яшчэ вернемся.

Горад аднаго акна ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Наваградак — велічная сталіца Вялікага Княства Літоўскага, унікальны горад на ўзвышшы, сама высокая мясціна Гродзеншчыны. Для беларуса ён нібы родны дзед, мудры і павучальны. У Наваградак немажліва не закахацца, трапіўшы туды аднойчы, хочацца прыязджаць яшчэ і яшчэ...

Жыць дастойна (2) ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

„Сышчык” Чарняўскай ☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Дажынкі ў Гарадку ☞ 10

Міра ЛУКША

ЗАПРАШАЕ

ПАГАВОРЫМ ПРА...
(ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ)

Месца сустрэч: Пачатковая школа нумар 4 Беласток вул. Чэнстахоўска, 6а,

18 ВЕРАСНЯ 2009:
Пагаворым пра Малую Айчыну
— сустрэча з Дарафеем Фіёнікам, старшынёй Таварыства „Музей Малой Айчыны” ў Студзіводах.

Праект рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

9 770546 196000

Горад аднаго акна

Наваградак — велічная сталіца Вялікага Княства Літоўскага, унікальны горад на ўзвышшы, сама высокая мясціна Гродзеншчыны. Для беларуса ён нібы родны дзед, мудры і павучальны. У Наваградак немажліва не закахацца, трапіўшы туды аднойчы, хочацца прыязджаць яшчэ і яшчэ. Ён прыгожы ў любую пару года — і ў пранізлівы студзеньскі сівер, калі снегу на старых завулках па пояс, і ў яснае лета, калі з Замкавай гары вока зачароўваюць далягляды. У наш час цэнтральныя пляцы горада закаталі ў каменную плітку, нібы хацелі ператварыць сярэднявечча ў Хатынь. Але знішчыць амаль тысячагадовы ліцьвінскі дух немажліва. Наваградак не страціў свайго шарму і па-ранейшаму вабіць падарожніка. Толькі сёння ён сапраўды ёсць горадам кантрастаў. З аднаго боку велічныя гістарычныя будынкі, з іншага — значная саветызацыя і суцэльная русіфікацыя. Мацнейшая, чым у іншых мясцовасцях Гродзеншчыны. Гэта мае сваё тлумачэнне. Наваградак яшчэ да другой сусветнай вайны меў моцныя нацыянальныя беларускія традыцыі. Іх кшталтавала найперш мясцовая беларуская гімназія, што дзеіла ў 1919-1934 гадах. Яе выпускнікамі былі многія, пазней вядомыя дзеячы беларускага руху ў розных праявах — Аляксандар Орса, Леў Гарошка, Ігнат Сланеўскі, Ніна Тарас, Барыс Кіт... А ў пасляваенны час узнік антысавецкі супраціў — у Наваградку была створана моладзевая падпольная арганізацыя — Саюз Вызвалення Беларусі. СВБ быў разгромлены спецслужбамі ў 1947-ым годзе, але маскоўская ўлада не магла дараваць гэтага гораду, пайшло татальнае знішчэнне ўсяго беларускага. Пераслед за беларускасць тут быў найбольш моцным. У выніку зараз у горадзе няма ні дэмакратычнай апазіцыі, ні адзінкавых дысідэнтаў, а рэшткі інтэлігенцыі сядзяць нібы мышы ў запечку.

Апошні прыезд у старадаўнюю сталіцу пацвердзіў тое, што горад зусім не развіваецца ў сэнсе інфраструктуры і адкрытасці для гасцей. У мясцовым гатэлі як звычайна напруга з месцамі. І не таму, што шмат турыстаў, папросту пакоі занятыя рознымі камандзіровачнымі. Кавярня ў гатэлі зачынілася, як сказалі — з-за нерэнтабельнасці. Суботнім ранкам шукаю дзе можна паснедаць. Марная справа, у прынцыпе — з'ява характэрная для кожнага горада Гродзеншчыны. Але ж Наваградак — гэта патэнцыйны турыстычны цэнтр! Урэшце знаходжу адзін адчынены бар, дзе кухня аднак чамусьці не працуе, праўда, кавы ўрэшце ўдалося напіцца. Шукаю газетны кіёск, але ўва ўсім цэнтры горада няма аніводнага такога шапіка. Той, што стаяў раней, кудысьці перанесены ці зліквідаваны зусім. Іншы, аддалены, зачынены. Бліжэй да абеду ўдаецца натрапіць на газеты ля аўтавакзала, але ўсе патрэбныя мне выданні ўжо раскуплены, кіяскёрка здзіўляецца, што я так позна захацеў іх купіць. Вось ён, медыйны „рынкавы сацыялізм" — дзяржаўным газетам і часопісам — усё роўна колькі іх прадаецца, а недзяржаўным, якія хутка б выцеснілі ўрадавыя папяровыя рупары, няма месца. Кнігарні ў цэнтры таксама няма, кніжкі выстаўлены толькі ў невялікім аддзеле мясцовага ўнівермага. Двойчы спрабаваў заплаціць за мабільны тэлефон, але ў банку, што стаіць побач з гатэлем, такія парадкі, што чэргі ледзь не на вуліцу выходзяць. Прытым, што некалькі супрацоўніц папросту сядзяць на месцы. Пытаюся чаму так кепска арганізавана праца — адказваюць: „А ў нас прынцып аднаго акна". Змарнаваў гадзіну часу, але свайго так і не дамогся.

З цэнтра скіроўваюся да знакамітага храма — Барыса-Глебскай царквы, якая доўгі час была катэдрай праваслаўных і ўніяцкіх мітрапалітаў. На пачатку вуліцы замест яе абазначэння, ці стрэлкі, што ўказвала б на помнік 16-га стагоддзя, вісіць таблічка „Туалет". Крыху далей вісяць дзве шыльдачкі — старая і новая, канешне ж па-чужынску — „Почтовая". Той, хто не ведае пра гэты славуты храм, можа да яго і не трапіць. Такой неахайнасці ў горадзе, на жаль, шмат. Нядаўна, праўда, выдадзена новая турыстычная мапа, але зразумела, што яна толькі на адной, такой любай мясцовым чыноўнікам, рускай мове.

Можа калі-небудзь зменіцца ўлада, у мясцовае самакіраванне прыйдуць людзі, якія па-сапраўднаму любяць свой горад і будуць мець адпаведны культурны ўзровень. І тады старадаўняя сталіца ліцьвінаў перажыве сваё сапраўднае адраджэнне. А пакуль Наваградак застаецца горадам толькі аднаго адчыненага акна — акна для наменклатуры, акна для чужынскага.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Штэпсель, інакш шпік

Калі я па прычыне цяжкай хваробы адышоў у 1969 г. са службы ў КБВ і, адчаканіўшыся, пайшоў працаваць у цывільнае прадпрыемства на паўштату, раптам стаў актыўным грамадскім дзеячам. Перш за ўсё я стаў першым сакратаром у вайскоўцаў на Новым Месце, раней чым Эдвард Герэк у ЦК ПАПР, а пасля папрасілі мяне быць сябрам Акруговай верыфікацыйнай камісіі арганізацыі ваенных ветэранаў ЗБОВіД, дзе я адначасова быў выбраны сябрам ганаровага суда. Пасля даваенны настаўнік, вязень НКУС Уладзімір Губар пайшоў у Гарадскі камітэт ПАРП з просьбай сарганізаваць у пасёлку Тысячагоддзя ў Беластоку партыйную арганізацыю ды назначыў мяне на сакратара. Але ў пачатках „выслужанага шпіка" будзе Акруговае праўленне Саюза барацьбітоў за свабоду і дэмакратыю.

Шэф акруговага праўлення папрасіў маёра, былога АКаўца (не скажу прозвішча, бо ўжо ён не жыве) і мяне паехаць у Вроцлаў. Там нам усё сімпатычна афармілі і пані старшыня запрасіла нас на абед. Пры стале — „мова-трава", але пані старшыня штосьці пра нешта стала наракаць і змоўкла ў паўслове. Я, ведаўшы ў чым справа, паглядзеў на яе і на „Н" ды сказаў: „Niech pani uważa, bo kolega może panią pokaleczyć". „Н": — „Co, co?" і пачырванеў, а пані да мяне з усмешкай: „Niech pan nie wymyśla, niczego takiego nie było". І мы з „Н" ніколі не перасталі калегаваць, ведаўшы кожны сваё.

У гэты ж самы час я такую славу пра сябе адчуваў і ў рэдакцыі „Нівы", куды часта заходзіў, бо мяне там дзяўчаты вучылі беларускай літаратурнай мове, а мужчыны ледзь пераносілі. Адна пані Вера Валкавыцкая хіба не верыла ў маю „шпікайскую" подласць, бо падарыла мне кнігу з прысвячэннем, што хутка навучуся размаўляць па-беларуску. Вядома, гэта было навырост, бо я і сёння не магу гэтым пахваліцца. Пасля быў сарганізаваны літаратурны клуб Саюза польскіх пісьменнікаў, куды і мяне чорт унёс, і нават я памог здабыць мэблю ў кааператыве БСМ для памяшкання гэтага клуба. Там таксама, але ўжо больш адкрыта, давалі зразумець мне „хто" я. Я гэта па практыцы вызначыў, бо я не „падкладваў" агентуру пад інтэлігенцыю — гэта была дамена III дэпартамента МУС; клуб, які гуртуе інтэлігенцыю, не будзе без „апекі" бяспекі. Але бяспека, каб забяспечыць даплыў інфармацыі, паставіла свайго агента, „падпаліўшы" мяне.

Аднойчы, пасля завяршэння пасяджэння, адзін з пісьменнікаў мне пры „чайку" сказаў у вочы: „Ты — з бяспекі, вазьмі і дапытай мяне!" А я: „Калі ты даскачашся, то не я буду цябе дапытваць". І канец гаворцы. Другі раз я пры кіёску сустрэў паэтэсу, якая жыве недалёка ад мяне і сказаў ёй „дзень добры", а яна адказала: „Ja pana się boję". Прайшло шмат гадоў, пані паэтэса пачала да мяне ўсміхацца. Ужо здавалася, што кляймо высахла і абсыпалася з маёй душы. Раптам, у 1982 годзе заходжу я ў рэдакцыю „Нівы" і сустракаю там майго дарагога Краця. Мы прывіталіся, а Крацё пытаецца: „Ты яшчэ сюды прыходзіш? Ужо не трэба даносіць ні ў камітэт, ні ў бяспеку". А я на тое: „Крацік, калі адкрыюць архівы, тады пабачым, хто даносіў". І на гэтым мы разышліся.

Прыгадалася мне адна сітуацыя, калі ГП БГКТ кіравалі Алесь Баршчэўскі і Кастусь Майсеня. Аднойчы ў аўтобусе я сустрэўся з дэпутатам Ваяводскай рады Марыюшам Бірулем, які мне паведаміў, што Ваяводская ўправа вырашыла ўрэшце аб пабудове вуліцы Янку Купалу і Якубу Коласу ў Беластоку. Я спытаўся, дзе прызначана месца пад вуліцу, а ён сказаў, што ў Старасельцах. Божа, я ад радасці ледзь дачакаўся наступнага дня, каб павядоміць сакратара ГП БГКТ аб такой цудоўнай навіне! Забягаю на восьмую ў ГП, і там сустракаю не толькі К. Майсеню, але і А. Баршчэўскага. Расказваю, у чым справа, а Алесь раіць мне паехаць у Старасельцы і распазнаць, ці гэта праўда, і дзе тое месца для вуліцы. Я паехаў і сваім сабачым нюхам якраз трапіў на таксіста, мыўшага пад яблыняй сваё аўто, і аказаўся ён яшчэ нейкім грамадскім дзеячам. Ён паказаў мне рашэнне ўлад і тое, дзе мае быць тая вуліца. Яно, тое месца, мне паказалася нявартым вуліцы не толькі нашым вялікім паэтам, але і нікому, бо было яно на руінах сцежачкі вядучай да палатна чыгункі, але...

Прыехаў я назад у ГП даць справаздачу з маёй паездкі, а тут уваходзяць у кабінет два „выдатныя дзеячы" (адзін рэдактар спытаўся ў мяне, у чым заключаецца іх выдатнасць...), і першы пытаецца: „А Петручук тут чаго?", другі змераў мяне позіркам з галавы да пят быццам таксама пытаўся: „Так, так, чаго ён тут?!" Баршчэўскі маўчыць, Майсеня маўчыць, а я дадумваюся, што аднак я — „штэпсель"!..

Васіль ПЕТРУЧУК

Вачыма еўрапейца

Няпоўны закон

Калі я быў у апошні раз у Сейме, дэпутаты абмяркоўвалі прыняцце закона аб увекавечанні наезду Савецкага Саюза на Польшчу 17 верасня 1939 г. Канчаткова ён не быў прыняты. Дыскусію выклікалі два праекты: адзін клубаў ГП, ПСЛ і СЛД, другі быў прапанаваны апазіцыйным ПіСам. Спрэчны пункт датычыў галоўным чынам паняцця „генацыд", які быў прыменены (у праекце ПіС) пры ўпамінанні злачынстваў у савецкіх лагерах палонных, між іншым у Катыні. Спрэчку выклікаў віцэ-маршалак Стэфан Несялоўскі (ГП) сказаўшы, што нельга прымяняць такога паняцця, бо „гэта было злачынства" ваеннае. Старшыня ПіС Яраслаў Качынскі не даў доўга чакаць і заявіў, што віцэ-маршалак Несялоўскі прайшоў „усе меры нацыянальнай лаяльнасці". Разам з былым маршалкам Сейма Людвікам Дорнам прадбачыў нават паданне заявы аб адкліканні Стэфана Несялоўскага з сеймавай пасады.

Мяне, аднак, зацікавіла рэшта зместу абодвух праектаў. Дазволю сабе прывесці некалькі — здаецца, важнах — слоў і сказаў. У праекце ГП-ПСЛ-СЛД чытаем: „Такім чынам быў учынены чацвёрты падзел Польшчы. Уваход Чырвонай Арміі адкрыў найбольш трагічны раздзел у гісторыі гэтай часткі Еўропы, да якога належаць так злачынствы ўчыненыя на польскіх жаўнерах, як і разня цывільнага насельніцтва. Вясной 1940 г. НКВД закатавала амаль 19 тысяч ваеннапалонных, польскіх афіцэраў, якіх трымалі ў лагерах на тэрыторыі СССР." Далей адзначана: „Сейм РП стаіць на пазіцыі, што польска-расійскае паяднанне патрабуе ўшанавання гістарычнай праўды. Нельга яе прамоўчваць ні ёю маніпуляваць.". У сваю чаргу ў праекце ПіС напісана наступнае: "Прыгадаем, што вынікам палітыкі СССР на ўсходніх тэрыторыях Рэчы Паспалітай быў праслед на нацыянальным і рэлігійным фоне ў вялікім маштабе: былі м.інш. забойствы польскіх афіцэраў у Катыні, чарговыя вывазкі соцень тысяч палякаў у ссылку, злачынствы на цывільным насельніцтве, крывавае змаганне з каталіцкім Касцёлам і іншымі рэлігіямі, закатаванне шматлікіх прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі, асабліва духавенства, людзей культуры і мастацтва". Было дадана: „Інспіраваныя на ўсходніх землях II РП Савецкім Саюзам акты нянавісці паміж пражываючымі на іх народамі давялі да трагічных вынікаў".

Не буду тут успамінаць пра паняцце „генацыд" (дарэчы, таксама ўрадавы калектыў расійскіх гісторыкаў, юрыстаў і г.д. схільваецца ўжо да прымянення гэтага слова калі гаворка пра катынскае злачынства). Маю ўвагу звярнуў факт прымянення рэдка падкрэсліванага факту, што якраз у Катыні і іншых месцах забойстваў пасля 17 верасня 1939 г. загінулі грамадзяне II РП: не толькі палякі і католікі. У Сейме спытаўся я старшыню клуба Грамадзянскай платформы ЗбігневаХлябоўскага, ці не трэба было б у законе пра гэта сказаць. Хвіліну задумаўся і адказаў:

— Можа быць. Яшчэ гэта не вырашана. Вы слушна заўважылі, што гінулі там не толькі грамадзяне Рэчы Паспалітай польскай нацыянальнасці.

На пытанне, як вытлумачыў бы ён жыхарам усходняй Польшчы, між іншым Беласточчыны, патрэбу прыняцця Сеймам такога закона, адказаў:

— Гэта важная гістарычная дата і памяць аб ёй у нас паляках [?! — М. Х.] будзе назаўсёды. Не дазволім, каб хтосьці за нас пісаў нанова гісторыю. 17 верасня 1939 г. расіяне напалі на Польшчу і загарнулі значную яе частку, асабліва тэрыторыю, дзе пражывалі людзі, аб якіх вы гаворыце. Трэба пра гэта ўспамінаць і якраз заўсёды.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Лепш з добрым згубіць чым з кепскім знайсці!

З нагоды юбілею 60-годдзя еду на сустрэчу з Мікалаем Бушко. Пад'язджаю пад яго бацькоўскую хату ў Навасадах. Спадар Бушко абрэзвае сухія галінкі пяцідзесяцігадовага вязу. Змяркае. Сядаем у новапабудаваным ганку.



Фота Ілоны КАРПЮК

***Мікалай Бушко** — нар. 1 верасня 1949 г. у вёсцы Навасады Гайнаўскага павета, сын Юльяна і Марты, муж Галены і бацька Паўла. Закончыў Тэхнікум драўлянай прамысловасці ў Гайнаўцы, Галоўную школу сельскай гаспадаркі ў Варшаве (інжынер тэхналогіі драўніны), студыю кіравання культурнай дзейнасцю ў Педагагічным аддзяленні Варшаўскага ўніверсітэта. Пасля сярэдняй школы кіраваў зменай у гайнаўскім Дзяржаўным тартаку, пасля ў семяноўскім аддзяленні быдгаскага прадпрыемства займаўся размеркаваннем плітавых матэрыялаў. Ад 1.02.1979 г. да 1.02.2003 г. працаваў дырэктарам Гайнаўскага дому культуры, у 1981 прыдумаў і з таго часу арганізуе Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка". З 1996 г. кіруе Фондам царкоўнай музыкі, з 1999 года вядзе Цэнтр прамоцыі рэгіёну „Чарлёнка".*

Ілона Карпюк: — ***Сядзімо зараз пад Вашай бацькоўскай хатай.***

Мікалай Бушко: — Так, але я ў ёй не нарадзіўся, гэта хата з пяцідзесятага года, а я — з сорак дзевятага. Нарадзіўся тут побач, у хаце, ад якой засталіся толькі камяні. А гэтыя камяні, што перад намі — з хаты маіх прадзедаў.

— А як далёка сягае Ваша сямейная памяць?

— У нас ніхто гэтым не займаўся, але дзесьці да прадзедаў з боку бабы, якая з Нікіцюкоў, і дзеда, з сям'і Янчукоў.

— Янчук гэта такое навасадскае прозвішча.

— Думаю, што так, хаця гісторыя Навасад не высветленая да канца. Датуецца іх недзе на тысячу семсот... з нечым, дзесьці так, як і ваша Бэрначчына *(смех)*. Але раней на старых мапах была і старая вёска, „на Сэліску", як у нас казалі, вырубвалі светлыя дубровы і там засноўвалі вёскі. Але гісторыя кажа, што там, на ўзгорку, не хапіла вады, дык перанесліся сюды, на другі канец вёскі, а рэшта? Называлі тут гэта Навасёлкі, людзі пасяліліся проста ў багне. Былі такія балоты, якія не высыхалі, мы ў гэтай багне яшчэ вучыліся плаваць, хадзілі па рыбу.

— А першы ўспамін з гэтага месца?

— Першы бліск з дзяцінства... месца, дзе захоўвалі бульбу, буракі, праўдападобна была гэта серада, ранак, ранняя вясна, бо бульба была выбрана, але копчыска яшчэ не раскідана, кудахтанне курэй, спеў пеўня, грукат фурманак, што ехалі на базар у Гайнаўку... Іншая карцінка: вечар, шорах, нейкі свояк прыехаў да нас, гарыць лямпа-газоўка, а я ўглядаюся ў цені фурманак. Займала мяне таксама постаць дзеда, не майго, але меў ён доўгія вусы, і мне цікава было, калі ён еў і іх аблізваў. І рэч, якая на мяне моцна паўплывала. Знайшоў я дзедаў пашпарт з першай сусветнай вайны. Пашпарты былі тады на дзвюх мовах, нямецкай і беларускай. Што цікава, не памятаю з гістарыяграфіі, каб быў тут нехта ў той час, хто займаўся нацыянальнай палітыкай, але так ці сяк хтосьці мусіў гэтых немцаў усведаміць. Памятаю, у гэтым пашпарце адціснуты быў дзедаў паказны палец ды напісана нацыянальнасць — беларуская. Быў у нас тут яшчэ такі цясляр, Мікалай, так і на яго казалі, не Нікалай ці Коля, і ён мне сказаў, калі пачала мне расці барада (дарэчы, мая сям'я ўжо мяне нават без барады не помніць, я быў проста лянівы і не хацелася мне яе брыць), і той жа Мікалай сказаў: „Коля, ты вельмі падобны на свайго дзеда". Я адказаў, што гэта немагчыма, а той: „Твой дзед як адзіны тут насіў бараду". І з гэтага моманту я веру, што спадчынныя рысы вяртаюцца ў наступным пакаленні.

— Ці Вы прыкмячаеце нейкія супольныя сямейныя рысы?

— Цяжка так адназначна адказаць. Памятаю гісторыю бабулі, — была яна вельмі зарадная, засталася адна з хіба шасцю дзяцьмі. А якраз у яе была першая крытая бляхай хата. А мае бацькі? Мне здаецца, што каб не жылі яны ў тыя часы, калі трапілі пад раскулачванне, то дзякуючы сваёй працавітасці былі б вельмі багатымі людзьмі.

— Значыць — працавітасць.

— Перадусім паслядоўнасць. Я, праўда, з самага пачатку быў прыхільнікам погляду, што трэба палюбіць усё, што робім. Хто любіў бы бясконцы выпас жывёлы?

— У час гэтага выпасвання Вы марылі, кім станеце ў будучыні?

— Не, не меў, здаецца, такіх мараў. Затое вельмі любіў чытаць, да сёння не разумею тых, хто марнуе час, нічога не чытаючы. Не навучыўся я таксама гуляць у карты. Можа ў нейкага „дурня" рэзалі; у „вока", у „бэта" ніколі не навучыўся, але шкадую, што не ўмею іграць у брыдж, пэўна ўжо і не навучуся.

— А цягне Вас да такіх стэрэатыпна мужчынскіх заняткаў ці спраў, як спорт, машыны, тэхнічныя цікавінкі?

— Спортам я, як амаль кожны, займаўся ў школе. Нават як вярталіся з поля, браў боты-шыпоўкі і бег недзе пад Катоўку, але з сённяшняй перспектывы гэта было крыху без сэнсу, бо на калдобінах лягчэй было нагу вывіхнуць, чым палепшыць вынікі. Спорт часам аглядаю, але я не яго нявольнік. Кажу пра шыпоўкі, але пакуль пайшлі мы ў школу, дык хадзілі басяком, а першыя пару гадоў жыцця бегаў я ў сарочцы-жупане. Вось такое дзяцінства: не беднае, бо бацькі мелі вялікую гаспадарку, бацька мой быў выдатным гаспадаром, але і нялёгкі быў гэта час.

— Першы сур'ёзны занятак?

— За выпас цётчыных авечак зарабіў я першыя грошы. За гэта пайшоў у кіно, якое нас наведала, памятаю, пускалі „У акопах Сталінграда". Недзе ў пятнаццаць гадоў працаваў я дрывасекам у лесе ў час канікул, зарабіў тады 640 злотых за 20 дзён работы.

— Бацькі наогул мараць аб тым, каб дзеці перанялі іх здабыткі, гаспадарку. Як было ў Вас?

— Бацька вельмі хацеў, каб я астаўся на гаспадарцы, але заадно разумеў, што гэта будзе складана. Я добра вучыўся. Прыходзілі настаўнікі намаўляць бацькоў, каб пусцілі мяне далей вучыцца. Да трэцяга класа скончыліся для мяне ўжо кніжкі ў бібліятэцы. Пайшоў у новую, тады элітную школу — Тэхнікум драўлянай прамысловасці. Памятаю, на экзамене здзівіла мяне, што ўсе прыйшлі з бацькамі. Мы дарасталі намнога хутчэй. Часам нават нам чарку ставілі, але за руку не вадзілі. Гарадскія вучні спачатку таксама глядзелі на нас згары, нават клікалі мяне не Мікалай, а Мікі. Пасля школы я адразу стаў на працу, канчаў вышэйшую школу ў Варшаве ды абрабляў з бацькам 10 гектараў зямлі. Быў таксама актыўны ў аматарскім культурным руху. Не забуду сказу з адной п'есы, здаецца, Яновічавай: „Я магістар, а мая мама непісьменная". Так было і ў нашай хаце. Мама навучылася падпісвацца толькі перад смерцю.

— А Вы хочаце, каб і Ваш сын пераняў бацькоўскія ініцыятывы?

— Думаю як кожны бацька. Натуральна, што хацеў бы, але час пакажа, як будзе. Можа ў яго такая непрыязнасць да гэтае ўсяе культуры. Калі я вяртаўся дахаты з працы, у час калі быў дырэктарам дому культуры, Павал пытаўся: „Тата, а ты яшчэ будзеш сёння вяртацца на працу?" Не мог я яму лгаць, таму адказваў: „Пайду, сынку". Хочацца, каб дзіця было бліжэй, але цешуся, што вы выхаваны ў павазе да нацыянальных спраў, што гэта для вас важнае.

— Калі б абдзерці Ваша жыццё з Фонду царкоўнай музыкі, з фестываляў, што засталося б?

— Здаецца, нічога! „Гонкі за мухамі", як сказаў Дарафей Фіёнік, займаюць зашмат часу. Нават у свабодны час псіхічна так і не адпачнеш. Але фізічна тут, у Навасадах, часам адпачываю. Бывае, уключу тэлевізар, каб пабачыць, што ў свеце. Найбольш часу, аднак, забірае бацькоўшчына, можа праз гэтую рысу, якая падказвае зрабіць усё самому. Але на гэта трэба было б жыць два стагоддзі.

— Адпачываеце таксама над Семяноўскім залівам.

— Цягне мяне туды, але можа таму, што помняцца мне яшчэ краявіды вёсак у даліне. Сенакос, калі ўсё выкашанае, папратанае, фурманкі, стагі. Памятаю, што гэта была бедная ваколіца. Лука. Шмат дзяцей. Вёска славілася ганчарствам, а хоць без гэтага немагчыма было жыць, гэты фах не быў у вялікай павазе.

— Чым найбольш ганарыцеся за гэтыя 60 гадоў?

— Гэты час — як імгненне. Памятаю, як я тут бегаў. Але напэўна ганаруся тым, што маю сына, сям'ю, што зрэалізаваў частку сваіх задум, што сустрэў мноства цудоўных людзей, добрых людзей, бо дрэнныя не памятаюцца. Маю такі характар, што забываю хутка ўсялякія шкодніцтвы. Незвычайны таксама час, у якім жыву. Цывілізацыйны скок, які перажыла вёска, але тэлефон, камп'ютар, мабільны тэлефон, інтэрнэт — не думаў, што кранем такой тэхнікі! Ну і месца, у якім жыву. Цешуся, што Пушча датрывала, хаця яна таксама іншая чым у гады майго дзяцінства.Усё дае такое ўражанне звышцікавага часу.

— А якое значэнне жанчын у Вашым жыцці?

— Жанчыны — найважнейшае! Я калісь увогуле быў улюблівы, было многа моладзі, але калі б мяне мая Галена не прычаравала, то можа і застаўся б старым кавалерам...

— Любіце бяседаваць. Які ключ да самай лепшай гульні?

— Быць з добрымі сябрамі! І гэта ўсё. У нас у вёсцы казалі, што лепш з добрым згубіць чым з кепскім знайсці. Але самае важнае: адчуваць сябе маладым. Я — малады духам!

Гутарыла Ілона КАРПЮК

Пакрыўджаныя лёсам ?

Калі чытаю ў „Ніве" пра беларускія імпрэзы арганізаваныя Беларускім таварыствам, дык сэрца сціскаецца да болю і крычыць: — Чаму пра Чаромху забылі? Чым жыхары гэтай маляўнічай мясціны правініліся, што ад чатырох гадоў Галоўнае праўленне са спіска іх выкрэсліла?

Да рэчы. З таго, што прыпамінаю, апошні фэст меў арганізавацца ў пасёлку 27 жніўня 2005 г. Але па прычыне БГКТ быў адтэрмінаваны (чытай: „Пагневаліся?" — *„Ніва"* № 40 ад 2.10.2005 г.). Прычыну адтэрмінавання я выявіў (неафіцыйна, вядома) у сваім допісе. Не стану затым перажоўваць падзей такой даўнасці. На маю думку, настаў час астудзіць эмоцыі і ўзяцца за станоўчую працу на ніве роднай культуры. Усё ж такі БГКТ лічыцца грамадска-культурнай установай. Ці ж не так? Хачу прыпомніць, што ў Чаромсе жыве шмат беларусаў. Дзеткі ў школе вывучаюць родную мову. А што застаецца старэйшаму пакаленню ў час адпачынку? Разумеецца, добрая музыка і песні. Не стану прыгадваць спадару Яну Сычэўскаму ды Валянціне Ласкевіч, як іх чарамшане віталі ў мінулым на фэстах. Шматлюдная аўдыторыя, гарачыя апладысменты і „бісы", гэта словы падзякі артыстам і пашана для арганізатараў. Што не дазваляе зараз спадару Старшыні арганізаваць культурнае мерапрыемства ў Чаромсе? З таго, што мне вядома, спонсары не прапалі, ды і самаўрадавыя ўстановы нейкі грош кінулі бы. Застаецца адно добрая воля з боку арганізатараў. А такой я, на жаль, не прыкмячаю. Варта адзначыць, што сябры ўкраінцы штогод арганізуюць у Чаромсе музычныя сустрэчы, ды і сёлета такое мерапрыемства адбылося 12 верасня. А мо і Беларускае таварыства раздумаецца і яшчэ сёлета рашыцца арганізаваць нешта ў Чаромсе? Чарамшане былі б за гэта ўдзячныя.

Уладзімір СІДАРУК

У Ольштыне і Голдапе

У міжнародным тэнісным Мемарыяле Марка Владарчыка з фондам узнагарод у 15 тысяч долараў, які ў жніўні адбыўся ў Ольштыне і сабраў на старце каля сотні спартсменаў з розных кантынентаў, перамог 19-гадовы беларус Уладзімір Ігнацік. Да пачатку турніру Ігнацік займаў 512-е месца ў мужчынскім рэйтынгу і быў пасеяны з пятым нумарам. У фінале мерапрыемства перамог ён з лікам 6:1, 6:3 польскага тэнісіста Марціна Гаўрана, які займаў 292-е месца ў тым жа рэйтынгу і ў турніры быў пасеяны з першым нумарам.

У Голдапе фінішаваў XV паўмарафон Гусеў — Голдап, у якім спаборнічалі 52 спартсмены. Сярод мужчын першым дыстанцыю ў 21 097 метраў адолеў беларус Ігар Жаваранак перад сваім суайчыннікам Алегам Хутнікам. Сярод жанчын беларуская бягуння Юдзянкова прыбегла на мэту другой за расіянкай Тарасавай.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Каб жыць дастойна (2)

Апошнім часам заўважаецца актыўнасць сельскагаспадарчага асяроддзя ў напрамку паніжэння гандлёвай накідкі на прадукты харчавання. Аднак такія прыгожыя агародніна і фрукты будуць купляцца нават па вышэйшых цэнах

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

(Пачатак у н-ры 37)

Спецыялісты па сельскагаспадарчай прадукцыі і гандлі яе вырабамі падлічылі, што нядаўна гаспадары прадавалі літр малака ў сярэднім па 86 грошаў (у выпадку большых вытворцаў, бо меншыя атрымлівалі ў гайнаўскім кааператыве нават па 50 грошаў за літр малака з меншай колькасцю бялка), малочныя кааператывы прадавалі яго ў кардоннай упакоўцы пасля пераапрацоўкі прыблізна па 1,40 злотых, а ў магазіне літр гэтага малака каштаваў у сярэднім у Польшчы ажно 2,40 злотых (таксама ў кардонцы). Відаць, што празмерна павышалася цана малака ў оптавых базах і магазінах. Калі ўзяць мясныя вырабы, справа мелася падобна. Свіное філе мясное прадпрыемства прадавала нядаўна па 11,5-12 злотых за кілагарам, а ў магазіне каштавала яно нават па 24 злотых за кілаграм. Гаспадар прадаваў кураціну па 3,5 злотага за кілаграм, мясная суполка — па 5 злотых, а ў магазіне каштавала яна ўжо па 8,5 злотага за кілаграм.

— Жыхары гарадоў абвінавачваюць нас, што мы прадаем свае сельскагаспадарчыя прадукты дорага, а праўда ёсць іншая. Мы прадаем нашы вырабы вельмі танна, а цана іх павышаецца найбольш у гандлі, — заяўляюць прадстаўнікі сельскагаспадарчага асяроддзя ў Польшчы, а нашы гаспадары наогул згодны з такімі меркаваннямі. Частка польскіх палітыкаў выйшла з прапановай, якая мела б лепш забяспечыць інтарэсы вытворцаў харчоў і заадно пакупнікоў, а перадусім абмежаваць выкарыстоўванне рэзультатаў цяжкай работы земляробаў для празмернага ўзбагачвання ўласнікаў суполак, займаючыхся гандлем сельскагаспадарчымі вырабамі. Нельга зараз увесці адміністрацыйных цэн збожжавых, малочных ці мясных вырабаў, але можна па-рознаму адклікацца да сумленняў пакупнікоў і аўтары новых прапаноў хочуць праз іх паўплываць на палітыку цэн у гандлі сельскагаспадарчымі прадуктамі. Прадстаўнікі Краёвай рады сельскагаспадарчых палат хочуць, каб чалавек, які купіць малако, сыр ці мясныя вырабы мог прачытаць на ўпакоўцы, колькі каштуе іх выраб. Прапануюць яны таксама, каб змяшчаць на ўпакоўках побач коштаў прадукцыі прапанаваныя цэны продажу перапрацаваных сельскагаспадарчых вырабаў, што паводле ініцыятараў новых рашэнняў павінна спрычыніцца да паніжэння накідак як у оптавых базах, так і ў вялікіх маркетах і малых магазінах. Прапануецца накідку ў гандлі на ўзроўні 20-30% ад коштаў канчатковай прадукцыі, а зараз бывае яна нават на ўзроўні 80%. Гэта мела б знеахвоціць пакупнікоў плаціць многа за харчы, якія высока падаражалі б у гандлі. Нашы земляробы наогул лічаць добрым рашэннем змяшчанне на ўпакоўках коштаў прадукцыі паасобных вырабаў.

— Нашы гаспадары бачаць, што ў гандлі многа зарабляюць на іх і злуюцца, — заяўляе Рыгор Мароз са Старога Беразова. — Я лічу, што добра было б паказваць, колькі каштуе выраб сельскагаспадарчых тавараў і нашы людзі павінны падтрымаць ідэю інфармавання на ўпакоўках пра кошты прадукцыі паасобных харчоў. Калі будзе на ўпакоўках таксама і прапанаваная цана, пакупнікі з гарадоў пераканаюцца, што мы іх не выкарыстоўваем.

— Гэта цікавая прапанова, каб паказваць кошт сельскагаспадарчай прадукцыі і цану продажу. Добра было б, каб гараджане даведаліся пра кошт выпрадукавання паасобных вырабаў, — кажа вядомы вытворца збожжа Ян Адамчук з Чыжоў.

Зараз мяркуецца, што самае таннае харчаванне прадаецца ў маркетах. Людзі з вёсак раскінутых вакол Гайнаўкі прыязджаюць у павятовы горад і часта першыя свае крокі накіроўваюць у „Каўфланд" ці меншы „Аргелан", распаложаны побач рынку, дзе між іншым купляюць харчы. Калі прыязджаюць на машынах, купляюць некаторыя прадукты оптам. Аднак апошнім часам штораз часцей закіды аб высокай накідцы накіроўваюцца таксама ў бок маркетаў. Напрыклад апублікавана, што памідоры гаспадары раней прадавалі па 1,5 злотага за кілаграм, оптава прадаваліся яны па 2 злотых, а ў маркетах каштавалі ўжо па 3 — 4 злотых. Вішні гаспадары прадавалі па 50 грошаў за кілаграм, пасрэднікі аддавалі іх па 1 — 1,5 злотага, а кілаграм вішань каштаваў у гэтым самым часе ў маркетах ажно па 3 злотых. Нават Міністэрства сельскай гаспадаркі разважае, каб паклікаць камісію, якая правярала б, ці маркеты высока не падбіваюць цэн харчоў, якія ў іх прадаюцца.

У гандлі кажуць: „Мы не вінаватыя"

Прадстаўнікі гандлю моцна крытыкуюць прапановы, што ідуць з сельскагаспадарчага асяроддзя і кажуць, што прадукты харчавання не могуць прадавацца па такой самай цане ў Варшаве, на ўсходзе і на захадзе Польшчы, а ў агульнапольскіх СМІ нават крыху падсмейваюцца з новых прапаноў земляробаў.

— Некаторыя суполкі самі паспрабавалі змяшчаць на сваіх прадуктах прапанаваныя імі цэны канчатковага продажу і гэта не дало чаканых рэзультатаў, — лічаць спецыялісты па гандлю. Хаця апошнім часам моцна патанела збожжа, а пры гэтым у час крызісу панізілася запатрабаванне на збожжавую прадукцыю, цэны мучных вырабаў трымаюцца ў сярэднім на тым самым узроўні, што былі і раней. Уласнікі пякарняў кажуць, што калі б узяць для прыкладу цану хлеба, дык убачым, што малое ўздзеянне на яе мае самая цана збожжа. Завяраюць яны, што толькі 10% у цане хлеба саставляе кошт мукі, якую выкарыстоўваецца для яго вырабу. Ажно 90% коштаў састаўляюць аплочванне рабочай сілы, транспарту, разлік за электраэнергію, купля і амартызацыя машын, будынкаў у якіх вядзецца прадукцыя ды выдаткаванне грошай на ўсялякія падаткі. Сельскім людзям цяжка пагадзіцца з такімі меркаваннямі, бо на вёсках нашы жанчыны масава пеклі хлябы ў мінулым і некаторыя старэйшыя жанчыны пякуць яшчэ і цяпер. Мука ў такой індывідуальнай прадукцыі састаўляе заўважальны кошт.

— Добра было б інфармаваць пакупнікоў на ўпакоўках аб коштах прадукцыі, але я не ведаю, ці гэта давядзе да нейкіх станоўчых рэзультатаў, калі гаворка пра нізкія цэны скупкі сельскагаспадарчай прадукцыі і высокія цэны яе продажу. У гандлі і так прадаюць за колькі схочуць. Я аднак за тым, каб была аднолькавая цана тых самых сельскагаспадарчых прадуктаў у розных месцах Польшчы, так як было пры камуне, — гаворыць чыжоўскі солтыс Андрэй Ціханюк.

— Цяжка было б рэалізаваць задуму з цэнамі на ўпакоўках, бо гандлёўцаў не прымусіш, за колькі маюць прадаваць харчы. Для здабывання большых даходаў з гаспадарання патрэбная між іншым большая адукацыя нашых земляробаў. Зараз гаспадар, які хоча атрымаць большы прыбытак з вырошчвання збожжа ці гадоўлі, павінен добра знаць хімію, біялогію і многія іншыя галіны спалучаныя з гаспадараннем. Аднак для нашай вёскі цяпер самая небяспечная дрэнная дэмаграфія. Калі я служыў у Сямятычах, там хоцькі-няхоцькі, але адно дзіця з польскай сям'і мусіла застацца на гаспадарцы, каб падтрымаць традыцыю, і таму польскія вёскі не пустуюць так, як нашы. Напрыклад, у нашым прыходзе частка дамоў пустая, у многіх жывуць толькі адзіноkія пенсіянеры і можна знайсці толькі некалькі буйнейшых гаспадароў, — заяўляе доктар тэалагічных навук, мітраформы протаіерэй з Рыбалаў Рыгор Сасна, які сам ад душы спачувае многім гаспадарам, што зараз штораз часцей апускаюцца ў беднасць з-за нізкіх цэн сельскагаспадарчых прадуктаў. Буйнейшыя гаспадары, такія як Ян Адамчук з Чыжоў, таксама хвалююцца з-за прадбачванага нізкага прыбытку.

„Сышчык” Чарняўскай

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Яна з’яўляецца адной з найбольш таленавітых мастакоў-жывапісцаў наймалодшага пакалення ў Польшчы. Ёй толькі 25 гадоў і паходзіць згэтуль, з беларуска-праваслаўнай часткі Беласточчыны. Як заявіў крытык мастацтва Стах Шаблоўскі, яе карціны „на першы кідок вока выглядаюць як найўнае мастацтва”. Але „гэта след свядома падкінуты гледачу мастачкай”.

Аляксандра Чарняўская, бо гэта так пра яе пісаў крытык Шаблоўскі, нарадзілася дакладна ў год, у якім Лявон Тарасэвіч, пражываючы ў Валілах маэстра мастацтва сусветнай славутасці, абараняў сваю тэарэтычную магістэрскую працу „Прысутнасць пейзажу...” ў майстэрні іншага мастака-маэстра, прафесара Тадэвуша Дамініка. Годам таму скончыла яна варшаўскую Акадэмію мастацтваў пасля студыяў у майстэрні... Лявона Тарасэвіча. Штудзіравала таксама на славутай Staatliche Akademie der Bildenen Kunste ў Штутгарце. Год таму стала стыпендыяткай фірмы Эрыксан і атрымала ўзнагароду імя Юзафа Шайны. Да гэтай пары выстаўляла свае працы ў некалькіх польскіх галерэях. Праз год мае паказацца ў беластоцкім „Арсенале”. На мінулым тыдні адбыўся яе вернісаж на варшаўскай Волі, у былой фабрыцы сям’і Лільпопаў, у галерэі „WizyTUjąca”, якую вядуць вядомыя сталічныя мецэнаты мастацтва Лешак Чайка і Івона Тэрлікоўская. Загаловак выставы: „Сышчык”. Больш за трыццаць карцін рознага фармату, каляровых і чорна-белых, паказаны ў невялікіх залах. Апынуліся тут партрэты, дрэвы, дамы, постаці завешаныя адна пад адной у гарызантальных пазіцыях, малы мужчынскі партрэт ляжачы на падлозе дагары нагамі абаперты аб сцяну. Асабліва дзве карціны прыцягваюць увагу. Адна гэта вісеўшая да паловы ўваходу ў галерэйныя парогі з домам і рыбамі нерэальнай, аграмаднай велічыні. Другі з быццам лятаючымі дрэвамі і, здаецца, бацькам з дзіцём на санках і выбіваючымся акварыумам-домам, у якім плавае нованароджанае дзіця з неадцятай яшчэ пупавінай. У працах Аляксандры дагэтуль часта вярталіся ператвораныя мастачкай гісторыі, якія расказваў яе дзядуля з роднай старонкі, з вёскі З., трагічна дасведчанай у час вайны і пасля яе. Аляксандра не хоча рассакрэчваць назвы вёскі:

— Стараюся не гаварыць, адкуль выводзіцца мая сям’я, бо не хачу шляхам мастацтва кранаць нікога персанальна. Непасрэднай інспірацыяй ўзнікнення цыкла былі гісторыі, якія расказваў мне мой дзедка, але сэнс цыкла значна шырэйшы і адкрываецца на іншыя тэмы, такія як, напрыклад, прырода. Свет прадстаўлены ў маіх карцінах найчасцей фільтраваны памяццю асобы, якая мне штосьці расказвае, а пасля дадаткова праз маю ўяву.

Дадае:

— Сям’я майго дзедкі была апошняй, якая засталася ў вёсцы. Дзедка мусіў неаднойчы ратавацца ўцёкамі. Быў сведкам трагічных падзей, калі сусед забіў суседа ці безабароннага мужчыну, які вярнуўся з прымусовай работы ў Нямеччыне, заатакаваны групай „партызанаў”. Наша вёска была рэлігійна і нацыянальна мешанай, а пасля вайны — ужо не. І не было гэта заслугай ані расіян, ані немцаў, а толькі г.зв. мясцовых партызанаў або г.зв. партызанаў прыезджых. Хто ў пару з нашай вёскі не ўцёк, быў забіты.

Падумаўшы:

— Напэўна ў мяне меншасная тоеснасць, але ўгрунтаваная больш у праваслаўі. Мяне выхавалі ў Беластоку, у горадзе бліжэйшым польскай культуры. Перажываю другасна захапленне беларускай культурай: стараюся мець кантакт з мовай. Валодаю ёю пасіўна, але надзеюся, што навучуся размаўляць вельмі добра. Я паходжу з праваслаўнай сям’і, якая аднак не падтрымлівала нацыянальных матываў. Не выхоўвалі мяне ў духу разваг над гісторыяй, пра якую расказваў дзедка. Я сама вырашыла яе адкрываць. Я выхавалася ў Беластоку. Вучылася ў І Агульнаадукацыйным ліцэі, раней у Пачатковай школе імя Сыноў палка. Толькі тады, калі я была ў ліцэі, дзедка пачаў мне расказваць аб тым, што адбывалася. Пасля было прачытанае, адно, другое, і я штосьці пачала разумець.

Чаму „Сышчык”?

— Сышчык гэта такая благая сіла, якая наганяе злыя выпадкі. Быў такі момант, калі беларусы і палякі наладзілі сабе ў ваколіцах, адкуль родам мая сям’я, канкурэнцыю: даносілі адзін на аднаго, абвінавачваючы адзін аднаго ў камунізме. Бывала, што кіравалі імі палітычныя матывы, часам звычайная людская зайздрасць. Такі выпадак здарыўся таксама ў ваколіцы, адкуль паходзіў мой дзедка. Я прысвяціла гэтаму адну карціну; няма яе на выстаўцы. Аб дыпломным цыкле „У вёсцы” і гэтым „Сышчыку” думаю як аб цэласці. Калі вешаю карціны, няма ў мяне нейкага плану, проста ўваходжу ў дадзеную мне прастору і кожны раз расказваю аб тым самым, але кожны раз той аповед праходзіць эвалюцыю.

А прырода?

— Прырода ў прынцыпе толькі на гэтай выставе пачала паяўляцца. Раней, хоць бы ў цыкле „У вёсцы”, былі фігуры і адносіны між імі, рух, падзеі ў часе. Тут больш зупынкі на прыродзе, з якой тыя постаці суіснуюць. Зіма, карціны з лесам, рака. Прысутная тут карціна з рэчкай з’яўляецца для мяне такім адыходам ад спосабу апавядання, які я дагэтуль прымяняла. Ад постацей з верхняй часткі карціны, якія кудысьці бягуць, дамоў, ніжнюю частку карціны залівае рака, непарушная сіла натуры. Раней карціны былі можа больш драматычныя. Гэтыя больш спакойныя.

Партрэты? Постаці ў гарызанталі?

— Патрэты я малюю са старых фатаграфій. Бывае, што гэта члены сям’і, часам людзі, якіх не ведаю, а якія проста мяне чымсьці зацікавілі. Постаці з гарызанталі спасылаюцца на плашчаніцу. Пераношу вядомае мне мысленне аб іконе. Пераношу вядомыя мне з іконы і фрэскаў у царкве спосабы апавядання. На карціне могуць знаходзіцца сімультанічныя здарэнні. Штось можа паўтарацца, дзеі могуць пераносіцца з адной карціны на другую, штосьці можа быць абмінута.

Колер?

— Мае працы засяроджваліся да гэтай пары на спосабе апавядання і аповедзе падзей. Не вяла я студыяў над колерам, я выбірала яго па эмацыйна-інтуітыўным прынцыпе. Мае карціны больш рысункавыя, чым жывапісныя. Якраз рысунак падказвае мне часта, які мае быць колер. Якраз у рысунку ёсць пачатак эмоцый, а пасля толькі падбіваю яго колерам.

Лешак Чайка тлумачыць, што захапіла яго ў творчасці Аляксандры Чарняўскай:

— Дзейнічае на маё ўяўленне. Аляксандра вельмі спелая эмацыйна і тое, што робіць, робіць вельмі свядома. Яе працы знакамітыя ў сваёй прастаце, рысункавай. З аднаго боку ёсць пластычны досціп, з другога — драма. Усё без перавялічвання, без ніякіх лішкаў. Рэдка сустракаецца такая гармонія ў спалучэнні з прастатой. Усе яе працы — паслядоўныя. Усё абдумана, нават у спосабе развешвання карцін.

Стах Шаблоўскі напісаў: „Кожную творчасць можна ў пэўным сэнсе бачыць як аўтапартрэт аўтара, і так ёсць і з мастацтвам Аляксандры Чарняўскай, хоць у яе працах дарма нам шукаць ўласнага адлюстравання мастачкі. У яе выпадку эскіз да аўтапартрэта ахоплівае больш чым адлюстраванне, выбягае далёка ў будучыню, з’яўляецца спробай разведання ўласнай тоеснасці. У гэтым плане змяшчаецца патрэба ўкаранення ў шматкультурнасці падляшскага пагранічча, у значнай частцы выцертай, замаскіраванай. Змяшчаецца тут таксама асабісты маштаб гісторыі, які выхінаецца з радзінных легендаў”.

Лявон Тарасэвіч у сваёй магістэрскай працы з таго „ваеннага” яшчэ 1984 года ўспамінаў: „... Такое вялікае слова як „жыпавіс” было ўздыманае на п’едэстал заўсёды самымі простымі сродкамі. ... Адна ўмова мусіла быць захаваная. Гаворка тут проста аб мастацкай праўдзе. Творца, які абманвае сам сябе, не павінен ніколі маляваць карцін.” Аляксандра Чарняўская — несумненна мастацка сапраўдная, нікому не маніць, перш за ўсё не абманвае сябе самой.

Выстава адкрытая да 3 кастрычніка.

Беларуска-польская дамова аб супрацы ў галіне аховы асяроддзя

У Белавежы падчас працы Міжнароднай канферэнцыі (11-12.09. 2009), прысвечанай 600-годдзю аховы Белавежскай пушчы, была падпісана беларуска-польская дамова аб супрацы ў галіне аховы асяроддзя. Міжурадавую дамову падпісалі міністры асяроддзя Польшчы і Беларусі **Мацей Навіцкі** і **Уладзімір Цалко**. Дамова дае магчымасць не толькі на мясцовым узроўні, як гэта было дагэтуль, рэгуляваць пэўныя справы, але, як зазначыў беларускі міністр, выйсці на больш высокі ўзровень супрацы. Як сказаў Уладзімір Цалко - *Паміж Гарадзенскай і Берасцейскай абласцямі і ваяводствамі, якія адносяцца да пушчы, весь час былі кантакты. Яны абменьваліся інфармацыямі, даследавалі паветра і ваду, збіраліся на канферэнцыі, інакш кажучы, тыя дзверы не былі зачыненымі. Гэтая прававая аснова дае магчымасць абедзвюм дзяржавам ужо на дзяржаўным узроўні займацца гэтымі пытаннямі, што тычацца вады, паветра, тэрыторыі і гэтак далей. Таму дзверы, па сутнасці, і былі адкрыты, мы толькі на дзяржаўным узроўні ўзаконілі гэтыя адносіны.* Міністр таксама зазначыў, што да фініша падыходзяць справы, звязаныя са стварэннем трансмежнага запаведніка Заходняе Палессе, які будзе размяшчацца на тэрыторыі трох краін — Беларусі, Польшчы і Украіны.

Канферэнцыю і прысутнасць на ёй міністра асяроддзя Польшчы выкарысталі няўрадавыя арганізацыі, якія займаюцца аховай прыроды.

Больш сотні асобаў — прадстаўнікі сусветнай арганізацыі Greenpe-

асе, WWF, Працоўні дзеля ўсіх істот, Таварыства аховы краявіду ды іншых няўрадавых арганізацый зладзілі пікет перад сядзібай Белавежскага нацыянальнага парку. На транспарантах вельмі красамоўны малюнак — перакрэсленая бензапіла і лозунг „Стоп выразкам”.

Удзельнікі пікету пераказалі патрабаванні забяспечыць належную ахову Белавежскай пушчы.

Міністр асяроддзя Польшчы Мацей Навіцкі, прыняўшы петыцыю зазначыў, што ён у гэтай справе поўнасцю салідарны з яе аўтарамі.

— Мы знаходзімся па тым самым баку. Хочам, каб пушча была салідна ахоўваная. Каб не высякалі старых дрэваў, якія там яшчэ ёсць. Я і вы аднае думкі.

Да 15 верасня мясцовыя самаўрады маюць тэрмін на тое, каб выказаць сваё становішча адносна пашырэння нацыянальнага парку, які па прапанове міністэрства павінен павялічыцца ўтрая.

Наталля Герасімюк,
www.racyja.com

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

ЗОРКА

для дзяцей і моладзі

Лянок з Вільні

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Спадабаўся калектыў „Лянок” з Вільні. Калі дзеткі сышлі са сцэны, іх віншавалі вядомыя людзі з Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы...

Канцэрт, у цэнтры літоўскай сталіцы, 6 верасня ўпрыгожыў IV З’езд беларусаў Балтыі.

— Вось чаго нам трэба да шчасця, — віншавала спевакоў узрушаная Зінаіда Бандарэнка, зорка беларускага тэлебачання з Мінска. — Сёння, як ніхто, вы сагрэлі нашы сэрцы.

Сапраўды, „Лянок” уразіў шчырасцю і добрай падборкай рэпертуару. І як арыгінальна, зладжана, па-сяброўску (быццам спявалі ля вогнішча) заспявалі „Пагоню”, — раз на словы Максіма Багдановіча і музыку Мулявіна, другі раз — на словы і музыку сучаснага паэта і барда Эдуарда Акуліна. Пра апошнюю заявілі: „Гэта любімая песня нашай школы!”

Гаворка пра Віленскую беларускую школу імя Францішка Скарыны, якая працуе з 1993 года ў сталіцы Літвы. У бягучым навучальным годзе ў школе займаецца 160 навучэнцаў. Музычны гурток „Лянок” існуе з 1994 года. Яго кіраўнічка — Валянціна Кавальчук:

— Мы выступаем на беларускіх, літоўскіх і міжнародных святах, — кажа апякунка, сама родам з Дзятлаўшчыны. — Вось нядаўна, з 23 па 29 жніўня мы падаліся ў гастролі пад лозунгам: Шляхам Вітаўта Вялікага. Выступалі ў Луцкім замку ва Украіне, у Гродне, Міры, Навагрудку...

У калектыве, разам з паняй Валянцінай (якая таксама выступае сола, іграе на гітары і гармоніку) шэсць дзяўчынак і адзін хлопец: Ангеліна Ясінская, Грэта Вінцукевічутэ, Вікторыя Малышка, Аляксандра Крывапуст, Элеанора Бухвальтэр, Дыяна Уждавініцэ і Уладзімір Іванаў.

— Нястрашна табе выступаць адному з дзяўчатамі? — пытаем Уладзіка.

— Наадварот, мне падабаецца выступаць з дзяўчатамі, — чуем у адказ.

На першы погляд, „Лянок” здаўся нам вельмі свойскі. У школьнікаў бела-блакітныя касцюмы як у нашых „Цаглінак” з Ляўкова”.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Васіль ХОМЧАНКА

Яблык

Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Вялікі, з залацістымі бакамі і празрысты. Нават зярняткі відаць. Пакруціў дзед у руцэ яблык, хацеў з’есці, ды перадумаў:

— Занясу дадому. Дзяцей пачастую.

Дома дзед адцаў яблык унучцы Ніне.

— Ой, які яблык вялікі! — усклікнула Ніна. І толькі яна хацела адкусіць, як прыйшла з работы маці. — Мамачка, — сказала Ніна, — ты стамілася. Вазьмі, з’еш яблык.

Маці падзякавала Ніне, узяла яблык, палюбавалася ім.

— Я Міхаську пачастую. Ён жа ў нас самы маленькі, — сказала маці. І калі Міхаська вярнуўся з дзіцячага сада, аддала яблык яму.



Міхаська нават ножкамі затупаў ад радасці, такі яблык яму далі — вялікі, залацісты, прыгожы!

Ен дастаў са скрынкі ножык, паглядзеў на дзеда, маму, Ніну і разрэзаў яблык на чатыры часткі.

— Гэта, дзядуля, табе, гэта маме, а гэта мне і Ніне, — падзяліў ён. — Ешце, калі ласка.

Смачны быў яблык. Салодкі, сакавіты. Усе елі, хвалілі Міхаську. А больш за ўсіх хваліў дзядуля.

Міра ЛУКША

Смачны плён

Параслі на славу
ў цёткі Міраславы
буракі, агуркі, памідоры,
палягалі гарбузы на разоры.
Парэй і сельдэрэй:
зелянейце хутчэй!
Яшчэ б! Каму неабходна,
каб зелянець прынародна,
а мы — хто чырвоны,
хто жоўты ці зялёны,
хто салодкі, хто салёны...
А каму абрыдла градка,
таму дарога гладкая:
пайшоў у латок:
бурак, агурок,
памідор ды парэй!
Шпарчэй!
Хрумсціць агурок!
Папаў часнок
на зубок!
Вітамінкі
бураковай бацьвінкі!
Румянец ад памідора!
І ўжо няма хворых!
Маркоўкі, пятрушкі...
Яблыкі ды грушкі,
Кальрабі, капуста...
На паліцах густа,
а на градках пуста.
Ды градка —
нягладкая.
Зноў зааруць і пасеюць.
А яны — узрастуць, даспеюць...
Нам на смак!
Вось так!

Каток сам цягне

Кажа матка чатырохгадовай Ганульцы:

— Ганулька, нашто ж ты цягнеш катка за хвост, гэта ж яму баліць!

— Я, мамачка, не цягну, а толькі трымаю за хвосцік, а каток сам цягне.

Аляксандра СМОЛІЧ

Орля

Мэтай нашай сённяшняй вандроўкі з'яўляецца Орля — мясцовасць, у якой у свой час пражывалі прадстаўнікі шматлікіх нацыянальнасцей ці нават рэлігій. У мінулым была яна таксама адным з важнейшых цэнтраў яўрэйскай культуры на Падляшшы.

Паводле расказаў жыхароў, назва Орлі ўзялася ад арлоў, гняздуючых у ваколіцы. Іншая версія паказвае на рэчку Арлянку, якая працякае праз гэтую мясціну. Назва ў гаворцы, якая гучыць *Вуорля*, паказвае таксама старажытнаславянскія карані.

Гаворачы пра Орлю і яе гісторыю трэба нам вярнуцца ў 1500 год. Якраз тады Аляксандр Ягелончык даў прывілею Яську Іванавічу на заснаванне горада. Гэтую прывілею ў 1507 г. пацвердзіў Жыгімонт Стары, і менавіта гэты год прынята лічыць годам заснавання горада Орля.

Фактычным заснавальнікам горада быў літоўскі казначэй Богуш Міхайла Багавіцінавіч, які ў 1512-1522 гг. стаў уласнікам Орлі. У сярэдзіне XVI ст. у арлянскія ўладанні ўваходзілі 9 мясцовасцей.

У выніку шлюбаў, пасагаў ды спадчын Орля пераходзіла да Тэнчынскіх, князёў Слуцкіх, а ў 1585 годзе ўвайшла ў састаў маёмасці адной з ліній Радзівілаў. І якраз гэтая магнацкая сям'я дала Орлі штуршок да буйнога развіцця.

Залатыя гады ў гісторыі Орлі наступілі асабліва ў часы Хрыстафора Радзівіла (1585-1640), які клапаціўся аб сваім падляшскім маёнтку (між іншым з увагі на яго стратэгічнае палажэнне). У 1634 г. Орля атрымала гарадскія правы і герб. У часы Хрыстафора Радзівіла разрасся таксама арлянскі двор, які знаходзіўся з боку Бельска-Падляшскага. Складаўся

Фота ЗБМ

ён з шэрагу будынкаў, над якімі ўзвышалася камяніца з вежамі ды замкавая царква св. Іаана Багаслова ды сабор кальвіністаў. У 1644 годзе тут адбыўся агульны сінод, які склікаў Януш Радзівіл, шчыры прыхільнік кальвінізму. Развіццё Орлі спынілі войны і неспакойны час 1655-1660 гадоў.

Гаворачы пра Орлю і яе гісторыю нельга нам забыцца пра яўрэяў, якія складалі вялікую частку грамадства гэтай мясцовасці. Першы ўспамін пра яўрэяў у Орлі датаваны 1634 годам. Карысныя ўмовы пасялення стварылі тут Януш і Хрыстафор Радзівілы. У XIX ст. арлянская бажнічная акруга налічвала амаль чатыры з паловай тысячы асоб, палова іх жыла ў Орлі. У свядомасці жыхароў тагачаснага Бельскага павета Орля была цэнтрам яўрэйскай духоўнасці.

Галоўныя памяткі, якія па сённяшні дзень прыгадваюць пра яўрэйскіх жыхароў Орлі гэта сінагога, якая знаходзіцца ў цэнтральнай частцы мясцовасці ды яўрэйскія могілкі — кіркут.

Сёння Орля гэта сядзіба гміны. Што цікавае, арлянская гміна з'яўляецца адной з трох гмін на Падляшшы, дзе ўведзена беларуская мова як дапаможная. Усе дакументы, заявы можна тут падаваць на беларускай мове.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Тузін. Перазагрузка! — што за цуд?

Перазагрузіць можна тону вугалю, але можна таксама перазагрузіць камп'ютар, што і пэўна часта некаторым здараецца. Мне — напэўна. Столькі ў камп'ютары музыкі, што часта марудзіць, круціць носам і адмаўляе паслухмянасці! Верце або не, але можна таксама перазагрузіць гурт! Гэта даволі цікавы працэс, але таксама вельмі важны. Не трэба прыціскаць нейкіх кнопак „плей" ці „стоп", ці „рэкорд". Сябры парталу „Тузін гітоў" і грамадскай кампаніі „Будзьма беларусамі" прыдумалі метад перазагрузкі гуртоў, каб усім гэта пайшло ў карысць.

Добра ведаеце, што большасць гуртоў у Беларусі спявае на рускай мове. У адных выклікае гэта сум і шкадобу, другія да гэтага ставяцца абыякава, іншыя кажуць, што гэта агульнанацыянальная мова і няма тут чаму здзіўляцца. Заснавальнікі „Тузіна гітоў" ведаюць, аднак, што хваля беларускамоўнай музыкі залівае штораз большую тэрыторыю Беларусі і вырашылі скарыстацца момантам. Разам з кампаніяй „Будзьма беларусамі", якая займаецца папулярызацыяй беларускай культуры, мовы, гісторыі, вырашылі падгаварыць дванаццаць выканаўцаў, каб свае вялікія рускамоўныя гіты праспявалі на беларускай мове. Што аказалася? Яны ўсе вельмі ахвотна заняліся працай над новымі варыянтамі песень. Напэўна і разумелі, што гэта будзе карысна таксама іх папулярнасці. Няхай прыкладам будуць тут вялікія зоркі як *J:Mors* ці *Ляпіс Трубецкой*, якіх беларускамоўныя песні ўзначальвалі гіт-парады.

У крузе выканаўцаў прадстаўнікі разнародных жанраў і музычных ідэяў, ад інды-рокавых музыкаў *Hair Peace Salon* па апошнюю „малую вялікую" зорку інтэрнэту, 13-гадовага *Юрку Дземідовіча*. У рамках праекту сустрэнеце таксама *Дакоту, Сяргея Пукста, Atlantic, Нестандартны варыянт, Стокс, Сэрца дурака, Tanin Jazz, Da Vinci, Naka* ды вядомую вам *Серебряную свадьбу*.

Праца над супольным дыскам ужо завяршаецца, а я маю надзею, што такі праект не толькі трапіць у нашы рукі, але можа ўдасца таксама здзейсніць яго ў Польшчы. Падляшскія музыкі заспявалі б не толькі на эсперанта, але, напрыклад, на беларускай мове!

basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 33:

Воз, аматары, поспех, жук, ліст, Ака, ластаўка, падарожжа. Слава, запіс, мост, мапа, лідар, рука, лыка, на.

Узнагароду — кампакт-дыск з беларускай музыкай выйграў **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Вішуем!



След 17 верасня

Аляксандр ВЯРБІЦКІ: — ***Сёлета мінае семдзесят гадоў ад уваходу Чырвонай арміі ў межы Польшчы. Тая падзея з 17 верасня 1939 года лічыцца датай уз'яднання Беларусі, і Украіны.***

Прафесар Яўген МІРАНОВІЧ: — Ніводзін з украінскіх ці беларускіх нацыяналістаў і дэмакратаў гэтага не аспрэчваў.

— ***Аднак я хачу вярнуцца да вытокаў. Калі паявілася ідэя Беларусі ў яе цяперашнім разуменні?***

Першы праект сучаснай Беларусі ўзнік у 1883 годзе, калі ў часопісе беларускіх сацыялістаў у Пецярбургу „Гомон" паказаўся артыкул пра патрэбу аўтаноміі Беларусі ў межах дэмакратычнай Расіі. Гэта была памылковая візія, бо беларускія сацыялісты спадзяваліся, што Расія незадоўга дэмакратызуецца і стане федэратыўнай дзяржавай, дзе кожная нацыя атрымае аўтаномію; гэта мела быць нешта накшалт цяперашняга Еўрасаюза. Гэты радыкальны праект паўтараўся і ў 20-м стагоддзі і да 1918 года не было праекту незалежнай Беларусі, адарванай ад Расіі. Дарэчы, калі глянуць на меры іншых народаў з беларускага суседства, напр. украінцаў, там былі радыкальныя плыні толькі ў Галіччыне, якія ўзніклі пад аўстрыйскім ці нямецкім уплывам, аднак у самой Расіі ўкраінскія партыі таксама імкнуліся да нейкай аўтаноміі. Калі глянем на народы, якія сёння прадстаўляюцца сімваламі імкнення да незалежнасці, напр. эстонцаў ці латышоў, у іх увогуле не было думкі пра аўтаномію. Там самі расійцы дапускалі аўтаномію дзеля паменшання нямецкіх уплываў. Таксама расійцам было карысна падтрымліваць літоўцаў дзеля канкурэнцыі палякам.

У гэтым кантэксце праект аўтаноміі Беларусі ў межах Расіі быў даволі рэальны, пры ўмове, што расійскі бок захацеў бы гэта ажыццяўляць, бо беларуская эліта гэта падтрымлівала. З боку палякаў былі намаганні прыцягнуць гэтую эліту да сваіх канцэпцый, асабліва лагер сацыялістаў Пілсудскага бачыў такую федэрацыю, але аказалася, што з беларускага боку не было на гэта водгуку, з дзвюх прычын. Беларускія сацыялісты не прадбачвалі, што Польшча адыграе якуюнебудзь ролю. І другі, вельмі істотны фактар: польскія сацыялісты — найбольш радыкальная партыя, не хацела кранаць пытання пра зямлю. Беларускія сацыялісты ў будучай дзяржаве прадбачвалі падзел зямлі, якая была ў руках польскіх землеўласнікаў, паміж сялян. Польскія сацыялісты, якія хацелі дзяліць зямлю на тэрыторыі этнічнай Польшчы, пра такі падзел на тэрыторыі Беларусі ці Украіны ўжо маўчалі, адтэрміноўвалі гэтую справу на пазнейшы час.

— ***Якая праслойка беларускага грамадства вынесла ідэю беларускай аўтаноміі?***

— У Беларусі з гэтым справа складаная, бо больш істотным быў рэлігійны фактар. Была тут інтэлігенцыя, якая выводзілася з розных асяроддзяў; найбольш было інтэлігенцыі, якая выйшла з дробных фальваркаў — з дэкласаванай шляхты. Але другую групу, мо нават большую чым першая, складалі сыны праваслаўных святароў, якія былі вельмі актыўныя не толькі ў беларускім асяроддзі, але і ў украінскім. Трэцюю групу складалі выхадцы з плебейскага асяроддзя. Пасля рэформаў 1860-1870-х гадоў у Расіі з'явілася невялікая, але даволі істотная група сялян, якая магла адукаваць сваіх дзяцей, пасылаць іх у Пецярбург. І тая інтэлігенцыя з'явілася.

Калі гаварыць пра каталіцкае асяроддзе, то там акцэнтаваўся фактар адбудовы Рэчы Паспалітай, асабліва зараз пасля Студзеньскага паўстання. Але неўзабаве ўзнікае праект заходнерусізму аўтарства Міхаіла Каяловіча. Ён сцвярджае, што беларусы, як частка вялікага расійскага народа — з вялікарусаў, маларусаў і заходнерусаў — павінны мець права на свае адметнасці. Ён згадваў пра аўтаномію для заходнерусаў не толькі культурную, але і адміністрацыйную. Гэты праект пасля пераймаюць сацыялісты. Прыгадайма тут, што католікі складалі ў Беларусі каля 15-20% насельніцтва, а праваслаўныя — 80%. Каяловіч выступаў ад імя тых васьмідзесяці адсоткаў, і незалежна ад таго, колькі людзей яго крытыкавала ці падтрымлівала, за ім стаяла тая статыстычная большасць, большая грамадская база, якая ў будучыні магла вырашаць пра лёс краіны.

У канцы 1890-х гадоў у Пецярбургу, дзе знаходзілася большасць адукацыйных устаноў Расійскай Імперыі, дзе найбольш людзей вучылася, дзе найлягчэй было знайсці працу, дзе найлягчэй было зрабіць кар'еру, пражывала каля ста тысяч беларусаў! Уся эліта, найбольш актыўныя людзі Беларусі, апынуліся ў Пецярбургу. Там студэнты, якія туды прыехалі палякамі, пад уплывам дзейнасці ўсялякіх груповак — рускіх, беларускіх, украінскіх, латышскіх, літоўскіх — у гэтым міжнародным асяроддзі лёгка знайшлі сваю тоеснасць. І аказалася, што ў Пецярбургу лёгка было дагаварыцца праваслаўным і католікам. Аказалася, што выхадцы з Беларусі на аснове сацыялістычных ідэй маглі трымацца супольных поглядаў. І ў тых сацыялістычных партыях у пачатку XX ст. няма ўжо так выразнага адрознення католікаў ад праваслаўных — ёсць толькі адзін беларускі інтарэс. Тая плынь, якая ставіла на адбудову Рэчы Паспалітай, фактычна знікае. Усе прымаюць візію будучыні Беларусі, блізкую канцэпцыям заходнерусізму — будаваць аўтаномію Беларусі, але ў паразуменні з расійцамі.

— ***Усё ж такі ўзнікла тэрытарыяльная адзінка, якая атрымала назву Беларусі, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Я дачытаўся, што бальшавікі стварылі яе па тактычных меркаваннях.***

— Гляньма на даты: БНР пад нямецкай акупацыяй праіснавала фактычна ад красавіка да лістапада 1918 года. У той час немцы дазволілі ствараць адміністрацыю, школьніцтва, займацца гаспадаркай — гэта шмат. Адміністрацыйныя структуры ўзніклі амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У той час выдаваліся беларускія пашпарты, у той час кожны жыхар Беларусі атрымаў інфармацыю пра беларускі ўрад. Праўда — больш дакучлівы з'яўляецца той, хто бярэ падаткі, а іх бралі немцы. Аднак усе адміністрацыйныя справы пісаліся на беларускай мове і ад імя беларускага ўраду. Таму бальшавікі ўсведамлялі, што праз тое паўгода нешта ў Беларусі здарылася, што да свядомасці мясцовага насельніцтва дайшла інфармацыя, што яны беларусы і што была нейкая беларуская дзяржава. Гэты факт бальшавікі маглі нават праігнараваць, але ім больш важным быў план паходу ў Еўропу. Трэба было паказаць, што народы, якія апынуцца пад бальшавіцкай уладай, будуць задаволены сваім лёсам, што вырашацца іх нацыянальныя справы; была гэта цынічная гульня бальшавікоў, бо ніякія народы іх не цікавілі. Мэтай бальшавікоў быў захоп Нямеччыны, гэта несумненна. Як паказваюць нядаўна выяўленыя дакументы, немцы выдаткавалі на ўнутранае разбурэнне Расіі, на бальшавіцкую групоўку, на прыход іх да ўлады і яе ўтрыманне, грошы вартасцю ў дзевяць тон золата. Аднак аказваецца, што ўжо ў першых месяцах свайго панавання частку тых грошай бальшавікі сталі выдаваць на падтрымку нямецкіх камуністычных груповак для падрыхтоўкі там рэвалюцыі, каб сваю ўладу пашырыць і на Нямеччыну. Нямеччына была больш надзейнай, у Нямеччыне былі рабочыя і план іх падпарадкавання Ленін стаў ажыццяўляць. Але па дарозе ў Нямеччыну былі яшчэ іншыя народы — беларусы, украінцы, палякі... Калі бальшавікі ішлі супраць Польшчы, у іх ужо быў гатовы ўрад і калі б не „цуд над Віслай", Польшча была б савецкай. У такім кантэксце, калі ўжо нейкая беларуская дзяржаўнасць узнікла, нельга было яе прамаўчаць, бо саветы ішлі б у характары акупантаў. Трэба было заступіць тую дзяржаву нейкай іншай. Тады бальшавікі аб'яўляюць стварэнне сацыялістычнай дзяржаўнасці Беларусі, аб'яўляецца нейкая канстытуцыя, паклікаецца нейкі ўрад. Гэта ўсё з'яўляецца чыстай фікцыяй, якая не мела нічога супольнага ні з чаканнем, ні з патрэбамі беларусаў. І вельмі цікавае, што ў адозвах бальшавікоў акрэсліваецца, з кім той урад Беларускай сацыялістычнай рэспублікі будзе змагацца — на першым месцы гэта структуры Беларускай Народнай Рэспублікі, а пасля ўсе абшарнікі, клерыкалы і г.д. БНР называецца там прадстаўніцтвам імперыялістычных сіл, буржуазіі і шляхты, ворагам народу і г.д. Усе найгоршыя прыметы прыпісваецца ўладам Беларускай Народнай Рэспублікі, хаця дзевяноста адсоткаў яе стваральнікаў складалі людзі сялянскага паходжання. Гэта паказвае, як бальшавікі ставіліся да беларускай дзяржаўнасці.

— ***Шыла вылезла з мяшка, калі пачаліся рэпрэсіі пасля таго, як беларусы паверылі ў свой шанс беларусізацыі, калі бальшавікі ўрэзалі Беларусі галаву, ліквідуючы яе эліты.***

— У бальшавікоў не было ніякай канцэпцыі ні грамадскага, ні палітычнага ладу, гэта ўсё была імправізацыя з самога пачатку, ад самога кастрычніцкага пераварота. Іхняя групоўка захапіла і ўтрымала ўладу супраць волі дзевяноста пяці працэнтаў расійскага грамадства. Ніводная палітычная групоўка не рашылася на такія рашучыя метады ўтрымання ўлады. Калі гаворым пра 1920-я гады, пра славуты НЭП, гэта ўсё адбываецца ва ўмовах, калі ў бальшавікоў няма ўжо ніякай канкурэнцыі. І прыйшло ім у галаву паказаць свету, як яны вырашылі нацыянальныя праблемы; свет захапіўся. Калі пад бальшавікамі найбольшыя злачынствы адбываліся ў 1919-1920-х гадах, у свабоднай англійскай ці нават амерыканскай прэсе пісалася пра дэмакратычны эксперымент у Расіі, што там ліквідавалі выкарыстоўванне чалавека чалавекам. Сацыялістычная і нават ліберальная прэса ў Англіі ці Амерыцы пісала, што такія вырашэнні магчыма чакаюць усю планету. Таму менавіта нацыянальная палітыка, якая праводзілася ў 1920-х гадах, мела паказаць свету, што вось з'явілася магчымасць вырашыць усе нацыянальныя праблемы, якія прывялі да выбуху першай сусветнай вайны — вайны не будзе, калі ў той ці іншай дзяржаве пры ўладзе будуць прадстаўнікі „сапраўднага" народу. Другой мэтай такой палітыкі было прыцягненне ў СССР эмігрантаў, якія апынуліся ў замежжы і ствараліі бальшавікам контрпрапаганду. І што бачым? Эмігранты вяртаюцца ў палове 1920-х гадоў; вяртаюцца беларусы, вяртаюцца ўкраінцы, вяртаюцца расійцы... Вітаюць Ластоўскага, даюць яму высокія пасады. Усіх беларускіх дзеячаў, якія ў Польшчы знаходзіліся ў турмах ці якім турма пагражала, прымаюць у савецкай Беларусі з вялікім гонарам. І чарговыя хвалі эмігрантаў вяртаюцца, асабліва з Літвы і Польшчы.

Але ў пачатку 1930-х гадоў, калі грамадства імперыі было ўжо знішчанае і не мела ніякай магчымасці фармавання свабоднай думкі, якое рэагавала толькі на лозунгі адзінага прапагандысцкага цэнтра, усемагутная расійская ўлада вырашыла закончыць гэты эксперымент. І яго вокамгненна закончылі.

У пачатку 1930-х гадоў чэкісты знайшлі нейкі Саюз вызвалення Беларусі з цэнтрам у Мінску. Рашэннем палітычнай паліцыі былі арыштаваны сотні чалавек, пасля чарговыя сотні. Каго арыштавалі? Усіх тых, хто ствараў беларускую культуру, навуку, усю эліту нацыі арыштавалі. Іх абвінавацілі ў г.зв. нацдэмакратызме. Я прачытаў сотні артыкулаў каб даведацца ў чым была сутнасць гэтага абвінавачання. Але гэта няважнае, бо тых людзей трэба было ў нечым абвінаваціць. І іх абвінавацілі і на працягу некаль-

кіх месяцаў іх вынялі з грамадскага жыцця. І няважнае, што іх тады не расстралялі; расстралялі пару гадоў пасля. На іх месца прыйшлі дзяўчаты і хлопцы з вёсак, якім сказалі: вось вам савецкая ўлада, дае тое, тое і тое, а вы маеце рабіць так і так. Ну і тыя маладыя людзі рабілі так, як ім загадвалі рабіць; яны не мелі ніякага ўяўлення, што можа быць інакш. Іх пераканалі, што няма лепшай сістэмы ўлады, як толькі ўлада якая іх, бедных людзей з непісьменных сем'яў, прывяла на пасады дырэктараў, у кіраўнічыя партыйныя структуры, зрабіла іх вучонымі. Улада навучыла іх думаць пасвойму. У 1930-х гадах узнікае грамадства, якое рэагуе паводле сімвалаў, якія ім пастаўляюцца з уладных цэнтраў. Няма тады і праблемаў з аб'яўленнем калектывізацыі, якая накіраваная супраць васьмідзесяці працэнтаў насельніцтва Беларусі. На шчасце, у Беларусі калектывізацыя не дала такіх трагічных вынікаў як на Украіне ці на Кубані, дзе багатыя землі. У Беларусі калектывізацыя адбывалася больш спакойна, аднак паводле статыстык, нават савецкіх, каля сотні тысяч людзей загінула або было вывезена з Беларусі. Вынік калектывізацыі, не толькі ў Беларусі, аказаўся трагічным — пакуль існаваў Савецкі Саюз палову харчовых прадуктаў трэба было купляць за мяжой. Немагчыма акрэсліць, колькі мільёнаў ахвяр яна праглынула. Цяпер расійскія гісторыкі асцярожна мяркуюць пра мінімум дваццаць пяць мільёнаў ахвяр тых эксперыментаў, якія праводзіліся ў 1920-1930-х гадах. Ніхто дакладна не ведае, колькі было ахвяр рэпрэсій 1920-1930-х гадоў у Беларусі. Як гэта было магчыма ў такім масавым маштабе арганізаваць пагромы цэлых рэгіёнаў? Калі чытаем дакументы 1937-1938 гадоў бачым, што нехта ў Маскве акрэслівае, колькі „ворагаў народу" ёсць у Мінскай губерні, Магілёўскай ці Віцебскай. І паводле акрэсленых у Маскве планаў забіваецца акрэсленая колькасць людзей, бо той план трэба выканаць. Калі хто яго не выканае, то яго самога заб'юць... Задзейнічала такая структура грамадства, што можна было знайсці выканаўцаў такіх шалёных планаў, якім цяжка знайсці аналагі ў гісторыі, калі ў адносінах да свайго насельніцтва можна праводзіць такія эксперыменты. Амерыканскі гісторык Рычард Пэйпс напісаў пра расійскую рэвалюцыю кнігу, у якой адзін з раздзелаў мае загаловак „Бальшавікі заваёўваюць Расію"; і гэта адэкватнае да сітуацыі, бо яны сапраўды ўзялі ўладу не са згоды народа, а ў выніку насілля. І калі разважаем пра ўсе падзеі таго часу, трэба ўлічаць факт, што савецкае грамадства было выхавана ў той сістэме.

— Ці больш-менш вядома, які быў людскі кошт бальшавіцкіх эксперыментаў у Беларусі да 1939 года?

— Гэта нявысветленае пытанне. Былі праведзены перапісы насельніцтва ў 1928 і 1938 гадах; вынікі апошняга перапісу па сённяшні дзень неапублікаваныя. Натуральны прырост быў даволі вялікі, а людзей атрымалася на мільён менш. Гэта не абазначае, што ўсіх людзей пабілі; маглі вывезці ў Сібір, маглі паслаць недзе на працу, неабавязкова прымусовую. Прагназавалася, што ў Беларусі ў тадышніх межах будзе каля шасці мільёнаў насельніцтва, а атрымалася менш чым пяць.

— У 1939 годзе адбылося аб'яднанне абедзвюх частак Беларусі. Што за няпоўныя два гады ўдалося саветам зрабіць у Заходняй Беларусі?

— Заўсёды пачаткі савецкай улады ўспрымаліся насельніцтвам даволі станоўча, асабліва беларускім грамадствам. Пры накіраванай на асіміляцыю палітыцы ўлад міжваеннай Польшчы, кожны з ліку двух мільёнаў беларусаў, хто хацеў неяк павысіцца, мусіў адрачыся ад сваёй нацыянальнай тоеснасці, адарвацца зусім. Таму мэтай шматлікіх арганізацый у II Рэчы Паспалітай было імкненне да аб'яднання, каб нацыя магла праіснаваць; каб тыя два мільёны не затраціліся, яны павінны мець шырэйшы кантакт з той большай часткай, якая была пад бальшавікамі. Таму ўваход Чырвонай арміі ў межы Рэчы Паспалітай не аспрэчваўся ніводнай беларускай групоўкай. Зразумела, цешыліся камуністы, якія лічылі, што дапоўніўся лёс і будзе адна, сацыялістычная Беларусь. Але ў КПЗБ беларускія сяляне былі толькі радавымі членамі, а ў яе кіраўніцтве беларусаў не было, і можна сказаць, што тая партыя не прадстаўляла ніякага беларускага інтарэсу. Фінансавалася партыя з Масквы, праграмы яе пісаліся ў Маскве. Хаця гэтая партыя была распушчана, аднак у 1939 годзе савецкія разведачныя структуры мабілізавалі тых сваіх камуністаў, якія арганізавалі прывітальныя брамы саветам. Але з пункту гледжання тых арганізацый, якія з камунізмам не былі звязаны, 17 верасня быў крокам, які набліжаў да незалежнай Беларусі.

У 1938-1939 гадах ва Усходняй Еўропе было чаканне вялікіх змен; гэта найлепш відаць ва ўкраінскай прэсе ў Польшчы. У той прэсе, якая друкавалася са згодай цэнзуры, кожная прамова Гітлера перакладалася на ўкраінскую мову. У прамовах Гітлера, са здымкамі Гітлера, падкрэсліваліся тыя вытрымкі, дзе гаварылася пра патрэбу змен ва Усходняй Еўропе. Усе адкрыткі пад новы 1939 год пісаліся з пажаданнем сустрэчы ў незалежнай, свабоднай Украіне. Гэта абазначала такую веру, што прыдзе Нямеччына і ўстановіць тут новы парадак. Дарэчы, Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў, якая цесна супрацоўнічала з нямецкім урадам, мела прыгнятаючы ўплыў на украінскае насельніцтва. Іншыя структуры таксама былі пад уплывам ідэалогіі АУН. Гэта паказвала, што найбуйнейшая нацыянальная меншасць у Польшчы, якая налічвала пяць мільёнаў чалавек, змену свайго статусу бачыла толькі ў нямецкай прысутнасці — вырашальнага фактару ва Усходняй Еўропе.

Сярод беларусаў так адкрытага чакання не было, але кс. Вінцук Гадлеўскі, які быў рашучым антыкамуністам, але і прыхільнікам незалежнай Беларусі, пісаў, што куды ні падацца — у горад, у вёску — усе чакаюць змен. Я чытаў сотні судовых пратаколаў, дзе беларускіх сялян абвінавачвалі ў г.зв. дэфетызме, калі яны гутараць паміж сабою, што неўзабаве прыйдуць саветы, а з захаду з'явяцца немцы; гэта 1938-1939 гады. У турму за такія размовы не саджалі, але прыкрасцяў было шмат, і ў 1939 годзе такіх размоў ужо паяўляюцца сотні і тысячы, а гэта абазначае, што насельніцтва так думала.

Ці чакалі саветаў? Не, не чакалі саветаў, чакалі нейкіх сваіх. Людзі памяталі нейкую Расію, хаця не лічылі сябе расейцамі, але тады была праваслаўная ўлада, не было прыніжэння іхняй годнасці. Можа не будзе лепш, але будзе больш зразумела, больш бяспечна. Чыноўнікі ў II Рэчы Паспалітай паводзілі сябе як нейкія аканомы, паліцыянты таксама глядзелі як на падазроных. Беларускія дзеячы гэтую сітуацыю называлі акупацыяй: тут польская, там расейская — гаварылася. Афіцыйна гэтай тэрміналогіяй не карысталіся, але ўладу лічылі чужой. Улада, якая з'явілася пасля 17 верасня, здавалася быць нашай: гаварылі „больш" па-нашаму, выглядалі так жа жаласна або і яшчэ горш чым мясцовыя сяляне. Але калі людзі сталі больш прыглядацца гэтай уладзе, тым салдатам, тым чыноўнікам, тады пабачылі нейкіх касмітаў, якія гаварылі невядома што. Пасля дваццаці гадоў камунізму нашы сяляне не маглі зразумець, што тыя прышэльцы да іх гавораць. Прыходзілі салдаты, якія жылі ў калгасе, і расказвалі, што пакінулі ў хаце жонку і вядро з вадою і не ведаюць, ці тая жонка жыве ці памерла ад голаду. Прывезлі сюды з савецкай глыбінкі дзесяткі тысяч турэмшчыкаў, якія працавалі поруч з мясцовым насельніцтвам. І такі турэмшчык расказваў, што атрымаў пятнаццаць гадоў за тое, што ўкраў у калгасе галоўку капусты. І тутэйшыя дзівавaліся, чаму ён краў тую капусту, а не ў сябе пасадзіў. Гэтаксама калі нехта атрымаў дванаццаць гадоў за некалькі каласкоў пшаніцы — гэта мясцовым у галовах не месцілася. А пасля, у 1940 годзе, сталі выходзіць першыя загады, сталі ствараць нейкія калгасы. У тыя калгасы загадчыкамі ставілі маладых камсамольцаў, 18-гадовых, якія ў чэрвені заганялі людзей касіць жыта. Людзі кажуць такому, што жніво толькі за месяц будзе, а ён тлумачыць, што атрымаў тэлеграму з Масквы, што ўжо цяпер трэба касіць. Калі ў 1941 годзе пачалі тут шукаць кулакоў, калі сталі знікаць людзі, тады мясцовыя сталі сапраўды баяцца.

Два гады савецкай улады пераканалі мясцовае насельніцтва, якое шчыра чакала нейкіх сваіх, што прыйшлі нейкія касміты, напэўна не свае. Таму ўжо пасля двух гадоў людзі зноў сталі чакаць змен, каб штосьці адмянілася. Новая ўлада стала невыносная, небяспечнай. Дарэчы, калі ў 1944-1945 гадах прыехалі камісары пераконваць мясцовае насельніцтва каб яно пакінула свае бедныя вёскі, а яны дадуць па дваццаць гектараў чарназёмаў за Волгай, ніхто ім не верыў; на Усход падаліся толькі тыя, што ўцякалі перад падполлем.

Калі гаварыць пра нацыянальную палітыку саветаў пасля 17 верасня, дык спачатку былі створаны беларускія школы, якія пасля некалькіх месяцаў сталі рускімі. Але калі бліжэй прыглянуцца гэтаму школьніцтву, то акажацца, што сапраўды, у 1939 годзе надрукавалі для мясцовых школ кніжкі на беларускай мове, але ўжо ў наступным годзе тыя ж кнігі выйшлі на польскай мове! І тут хутка сталі ствараць умовы для развіцця польскага школьніцтва. Не дзеля асіміляцыі беларусаў, толькі дзеля падгатоўкі кадраў для стварэння чарговай савецкай рэспублікі — польскай, якая была ў планах савецкага паходу на Захад. Усе фактары паказваюць, што Чырвоная армія затрымалася тут толькі часова. Дарэчы, апублікаваныя прамовы Сталіна наконт пакта Рыбентроп-Молатаў паказваюць, што быў гэта чыста тактычны ход, бо сапраўднай мэтай саветаў быў выхад на Атлантыку. Польшча была адно этапам, а сапраўднай мэтай была Нямеччына і ішло пра тое, каб вайна на Захадзе даўжэй працягнулася. У Францыі кампартыя мела значныя ўплывы, разлічвалася таксама на адбудову структур нямецкай кампартыі, якая ў пачатку 1930-х гадоў мела 30-працэнтную падтрымку насельніцтва.

У Маскве разлічвалі, што Еўропа толькі чакае Чырвоную армію. Усе савецкія ваенныя планы былі ў 1941 годзе напраўленыя на атаку; савецкія афіцэры мелі карты Польшчы, карты Нямеччыны, але не было ў іх карт Беларусі ці Украіны. І калі адступалі, не ведалі, дзе яны, што з імі дзеецца, не спадзяваліся, што нехта заатакуе савецкую армію.

— Я вярнуся яшчэ да даты 17 верасня: калі ў сапраўднасці завяршылася аб'яднанне заходняй і ўсходняй частак Беларусі?

— Працэс пачаўся ў 1939 годзе. Ва ўсходніх ваяводствах працэс праходзіў хутчэй, хутчэй там адбывалася калектывізацыя, усе змены, а чым далей на захад, там такія працэсы адбываліся больш памяркоўна. Аднак у сапраўднасці калектывізацыя ў 1939-1941 гадах закранула толькі некалькі працэнтаў зямлі. Зараз пасля вайны калектывізацыя не праводзілася па дзвюх прычынах. Усталявалася новая дзяржаўная мяжа, а на тэрыторыі, якая перайшла ад Польшчы ў савецкую Беларусь, прыватныя гаспадаркі існавалі да 1950-х гадоў. Дарэчы, мела тут адбыцца перасяленне насельніцтва: палякаў у Польшчу і беларусаў у Беларусь. Але хутка высветлілася, што з Польшчы можна ўзяць максімальна 150 тысяч чалавек, а трэба было б у Польшчу аддаць 550 тысяч. Калі апусцелі вёскі, калі ў Беларусі не хапала рук да працы, аддача тых чатырохсот тысяч людзей была без сэнсу. Таму ў Беларусі сталі пераконваць каталікаў, што яны ў сапраўднасці не з'яўляюцца палякамі, толькі беларусамі; упершыню ўлада пераконвала каталікаў на тэрыторыі Беларусі, што яны — беларусы. Ствараліся штучныя перашкоды, каб яны толькі не выязджалі. Часам пішацца, што людзей з Савецкага Саюза выганялі, але ў сапраўднасці было акурат наадварот: людзі ўсяляк хацелі выязджаць. І гаварылі ім, што калі маюць яны гаспадаркі, то ўлада гэтых гаспадарак не забярэ. Гэтак было да 1950-х гадоў — ніякія рэформы на вёсцы не праводзіліся. І чалавеку, у якога трыццаць гектараў зямлі, статак кароў, які ў прынцыпе жыве ў згодзе з суседзямі, жаль пакідаць усё гэта. Таму каталіцкія сяляне ў большасці і асталіся ў сваіх вёсках. Выехалі людзі з гарадоў, з Гродна, Ліды, дзе іх нішто так моцна не вязала, як зямля вяскоўцаў.

Калектывізацыя стала заглядаць у заходнебеларускую вёску ў 1949 годзе, калі пачаліся новыя грамадскія эксперыменты. Пачалася індустрыялізацыя, людзі спатрэбіліся прамысловасці, таму на вёсцы трэба было стварыць такія ўмовы, каб людзі сталі адтуль уцякаць у горад; і такія ўмовы, у выглядзе калгасаў, ствараліся.

А ў сапраўднасці тое аб'яднанне ў людской псіхіцы яшчэ не адбылося па сённяшні дзень. Людзі на захадзе Беларусі бачаць інакш нават эстэтыку сваіх панадворкаў: нейкія платы ставяць, неяк хату ўпрыгожваюць. Усё гэта на ўсходзе Беларусі выглядае інакш — там менш платоў, менш агародаў, тамашні краявід больш нагадвае Смаленшчыну, якая яшчэ больш бедная чым усходняя Беларусь. І патрэбы чалавека, у выніку голаду перыяду калектывізацыі, бачацца на ўсходзе меншымі, чым на захадзе Беларусі. Там, дзе бальшавізацыя адбывалася даўжэй, там яна пакінула трывалейшыя сляды, яе цяжэй адвярнуць.

— Дзякую за размову.

Мокрыя дажынкі ў Гарадку

У Гарадоцкай гміне раней гмінныя дажынкі спраўляліся ў Залуках, невялікай ды вельмі баявітай вёсцы, і была гэта для яе вельмі важная падзея. У гэты раз (6 верасня) запрасіла на свята земляробаў гмінная сталіца, у месца адпаведнае для большых мерапрыемстваў — над вадасховішча ў Зарэчанах, што зараз за Гарадком. Над гарадоцкім возерам месца хоць адбаўляй, жыхары і іх сябры ахвотна адпачываюць на ўлонні прыроды і прыязна ставяцца да рознага віду і жанру культурных мерапрыемстваў. Ды ў гэты раз надвор'е выразна спалохала большасць патэнцыяльных гасцей. І сціплей выглядала таксама багацце, якое заўсёды аздабляе сцэну і яе наваколле. Можа таму, што ў гэты раз не былі адпаведна запрошаны пастаўшчыкі „цудаў натуры", якім тыя чамусьці заўсёды растуць на славу на іхніх дагледжаных градках і палетках. І ўсім вядома, у каго яны найбуйнейшыя, найпрыгажэйшыя.

Старосты дажынак Дарота Вільдовіч і Браніслаў Казбярук.

У гэты раз пахваліцца сваімі гадаванцамі маглі гарадоцкія гадоўцы аздобых курэй з Саюза „Gallus" — Рыгор Кузьміч і Аляксей Лакель. Іхныя феніксы, чубаткі, пушыстыя, ядвабныя, белачубы... — і вялікія, і маленькія — у клетках непадалёк сцэны адважна давалі знаць аб сабе: невялічкім пеўнікам не трэба было мікрафонаў! Можна было купіць пару курак па 150 злотых, а куранятак — па 20 злотых. Такія куркі не толькі пацеха і аздоба гаспадарак: нясуцца яны не горш ад звычайных „галюсаў дамесцікусаў", значыць, хатніх курэй, і хоць яйка ў іх меншае, жаўток у ім параўнанальна вялікі і гэтыя яйкі вельмі смачныя. „Бываюць і белыя, і жоўтыя, і такія, якіх не трэба фарбаваць у цыбульніку на Вялікдзень!" — хваліў вытворчасць сваіх курак Аляксей. Абодва гадоўцы ўзялі за ўзор вядомага мастака і любіцеля аздобных птушак Лявона Тарасэвіча, ад яго набылі першых курэй, карысталіся і карыстаюцца ягоным досведам, а і самі ўжо майстры, а іхнія куркі — медаліскі нават замежных выставак... Пеўнікі, чым меншы тым больш галасісты, шораз перакрыкавалі выступоўцаў са сцэны, нават гмінных чыноўнікаў! А прывіталі гаспадароў і гасцей (быў нават беластоцкі староста) войт Веслаў Кулеша і Вечаслаў Госцік, айцы Мікалай і Станіслаў пасвянцілі плён. Айцец Мікалай Астапчук прыгожа па-беларуску сказаў пропаведзь пра пашану для хлеба і працы земляроба. Карагод з вянкамі вялі старосты дажынак — найлешыя гаспадары Дарота Вільдовіч і Браніслаў Казбярук. Народны паэт Анатоль Пярэмбскі прачытаў спецыяльна на гэтую нагоду напісаны верш. І на сцэну запрасіла Марыя Врублеўская самадзейнікаў-гаспадароў — „Расспяваны Гарадок" і „Каліну" з Залук, заслужаных дзеячаў беларускай культуры. Апрача сталых гарадоцкіх калектываў — „Асенняга ліста" і „Хутара", на сцэне выступіла бадзёрая „Казка" з гарадоцкай школы (у гэты раз на свае каляровыя сонечныя блузачкі мусіла апрануць штосьці цяплейшае). „Казка", расслаўляючая Гарадок і тутэйшых аўтараў, хоць маладзенькая, вартая ўжо ўвагі, таксама Культурнаму цэнтру Беларусі: малыя спевакі маюць надзею атрымаць беларускія строі... Іншы малады ансамбль з Гарадоччыны ў гэты раз выступіў у дзвюх іпастасях: дазволілі ўрэшце сапраўднай, карэннай „Калінцы" з Залук выступіць у сваіх беларускіх строях ды на сцэне са сваімі песнямі, з якімі заваёўвалі прызнанне і прызы на фестывалях — чым выклікалі вялікае захапленне і падтрымку павальнага ліку гледачоў (апрача адной асобы), а неўзбавае на сцэну выйшла другая „Калінка" ў такіх самых характэрных строях і заспявала са свайго дыска, які нядаўна выйшаў пад славутай ужо назвай.

Вельмі хораша выступілі таксама „Журавінкі" з Агароднічак і „Незабудкі" з Курашава, якія падрыхтавалі цэлую забаўляльна-музычную праграму, што прагнала цёмныя хмары і вельмі шчыра і моцна развесяліла публіку. Прыняла яна таксама вельмі прыязна маладзенькі гурт з Нарвы „Narva" (Пеця Якубоўскі, Войтак Свентахоўскі, Давід Юшкевіч і Каміль Самойлюк). Так што той, хто не пабаяўся дажджу, не пашкадаваў таго, што прыйшоў на дажынкі над гарадоцкім вадасховічам!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Знаходжанне Беларусі паміж дзвюма цывілізацыямі — рускай і заходнееўрапейскай будзе заўсёды ставіць яе насельніцтва перад выбарам: да каго хіліцца? Так працягнецца да той пары, пакуль гэты люд не адчуе сябе народам і не ўсвядоміць Беларусь як нешта ўласнае, самадастатковае і не патрабуючае нічыёй прыхільнасці і незважаючае на нічыё грэблівае стаўленне. Для гэтага, зразумела, спачатку мусіць быць нейкая павага да ўласнай гісторыі, культуры і мовы.

Пакуль што сярод палітыкаў у Беларусі пераважае жаданне прапанаваць насельніцтву „ўсходні" альбо „заходні" выбар. Такія рэаліі часу. Таму натуральна будзе зазірнуць на адзін з сайтаў, які заклікае Беларусь у Еўропу. Называецца ён адпаведным чынам: „Беларускі еўрапейскі форум".

Месціцца вышэйазначаны сайт у інтэрнэце па адрасе http://euraforum.info. Варта адзначыць, што сайт узнік зусім нядаўна і сапраўднай мэтай яго існавання ёсць падрыхтоўка аднайменнага форуму, які мусіць прайсці праз два месяцы. Таму, з большага, там распавядаецца пра надыходзячы форум, яго ідэйнае напаўненне. „Беларускі еўрапейскі Форум — гэта ўнікальная інфарамацыйнадыскусійная пляцоўка па пытаннях супрацоўніцтва Беларусі і Еўрапейскага Звязу, — распавядаюць натхняльнікі форуму з першай старонкі сайту. — Гэта дыялог, удзел у якім можа ўзяць любы грамадзянін Беларусі: падзяліцца сваім бачаннем і даведацца пра меркаванне вядомых асобаў Беларусі і Еўропы".

Арганізатары форуму лічаць, што Беларусь сёння „бліжэй чым калі да змены геапалітычнага выбару". Такая ўпэўненасць узнікла ў іх з-за сусветнага эканамічнага крызісу і „нестабільнасці стасункаў з Расіяй". Таму, як мяркуюць „беларускія еўрапейцы", „пры актыўным удзеле кожнага грамадзяніна Беларусі, падтрымцы з боку грамадзянскай супольнасці, пры палітычным плюралізме намаганні Еўрапейскага Звязу па вяртанні Беларусі ў еўрапейскую сям'ю дадуць плён".

З таго ўзнікае мэта „Беларускага еўрапейскага форуму" — „падтрымаць паварот Беларусі ў бок Еўрапейскага Звязу, зрабіць незваротнымі працэсы еўрапеізацыі Беларусі, мабілізаваць прыхільнікаў і аб'яднаць патэнцыял беларускіх праеўрапейскіх сілаў".

Калі звярнуцца да іншых рубрык сайта, то іх не надта многа — усяго чатыры. На дзвюх з іх падаюцца апошнія навіны беларускай „еўраінтэграцыі" і інфармацыя пра рэгіянальныя сходы прыхільнікаў арыентацыі на Еўропу.

Яшчэ адна рубрыка — „Дакументы і матэрыялы", прадугледжана для азнаямлення зацікаўленных тымі афіцыйнымі паперамі, якія будуць выходзіць ад імя „Беларускага еўрапейскага форуму". Праўда, пакуль нават праектаў гэтых дакументаў на той старонцы няма. Разам з тым распавядаецца аб агітацыйнай кампаніі, якую распачынае форум: „Часткай агульнанацыянальнай кампаніі „Беларускі еўрапейскі форум" з'яўляецца таксама шырокае інфармаванне насельніцтва аб перавагах еўраінтэграцыі. Дзеля гэтага Рух „За Свабоду" плануе распрацаваць пасланні да шэрагу сацыяльных групаў, якія будуць тлумачыць выгоды ад еўраінтэграцыі для прадстаўнікоў гэтых груп. Пасланні будуць прэзентаваныя ў выглядзе асобных брашураў на працягу восені 2009 г."

Пакуль яшчэ толькі пачатак восені. Пытанне, ці пройдзе яна пад знакам еўраінтэграцыі альбо адзначыцца ўсплёскам чарговага братання з Крамлём, наўрад ці мае істотнае значэнне.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Захавалі гонар

На мінулым тыдні ў Еўропе быў вялікі футбольны дзень — праходзіла мноства сустрэч адборавага турніру да чэмпіянату свету. Зборная Беларусі, якая мела апошнія тэарэтычныя шанцы на выхад у плэй-оф, прымала ў Мінску дружыну Украіны, якая прэтэндуе на 2-е месца ў групе. Баявы жывы матч завяршыўся мірам — 0:0. Апісваць перыпетыі сустрэчы няма сэнсу. Галоўнае, што матч быў сумленным і каманда Бернда Штанге прынамсі захавала гонар. У нашай жа групе Казахстан адолеў у гасцях Андору — 3:1, а каманда Англіі разграміла Харватыю 5:1 і датэрмінова, выйграўшы ўсе 8 (!) матчаў, забяспечыла сабе права гуляць на чэмпіянаце свету. Харваты маюць 17 пунктаў, а Украіна 15 і гульню ў запасе. Наступную сустрэчу (яна пройдзе ў Брэсце 10 кастрычніка) беларусы, якія маюць толькі 10 ачкоў, правядуць са зборнай Казахстана.

Блізкая развязка змагання за запаветныя пуцёўкі ў Паўднёва Афрыканскую Рэспубліку (менавіта там пройдзе фінальная частка першынства планеты) і ў іншых групах. Ёсць сэнс прыкінуць спіс усіх рэальных і патэнцыйных іх уладальнікаў. У 1-й групе найбліжэй да поспеху Данія (18 ачкоў), другое месца найверагодней дастанецца Швецыі (15) ці Партугаліі (13). У 2-ім секстэце відавочны фаварыт зараз Швейцарыя (17), другая пазіцыя хутчэй за ўсё вызначыцца ў асабістым спаборы Грэцыі і Латвіі (па 14). Пры пэўным раскладзе на жаданую прыступку можа ўскочыць і Ізраіль (12). У 3-й групе свае парадкі нечакана дыктуе Славаччына (19), якой застаецца зрабіць адзін маленькі крок. На другое месца маюць шанцы ажно чатыры зборныя, сярод якіх вышэйшыя акцыі Славеніі (14) і Чэхіі (12). У 4-й групе прэтэндэнтаў толькі двое — Германія (22) і Расія (21). Расклад пазіцый вызначыць вырашальны бой у Маскве 10 кастрычніка. У 5-й кампаніі пераможным маршам прайшлі чэмпіёны кантыненту іспанцы (абсалютны вынік — 24 ачкі) і забралі „чысты" білет. Да выхаду ў плэй-оф блізкая Боснія і Герцагавіна (16), аднак у яе няпросты графік астатніх матчаў, і Турцыя (12) яшчэ можа цешыцца ілюзіямі. Закрутка ў 7-й групе таксама спрасцілася. Сітуацыя там зараз выглядае так: Сербія як мінімум гарантавала сабе другое месца (19), а далей ідуць Францыя (15) і Аўстрыя (11), апошняя мае толькі прывідныя шанцы. У 8-й групе выразна дамінуе Італія (20), наўрад ці што перашкодзіць Ірландыі (16) захаваць другую пазіцыю. Нарэшце ў 9-ым урэзаным квінтэце турнір ужо закончыўся. Нідэрланды першымі ў Еўропе, перамогшы ва ўсіх 8 матчах праштампавалі сваё права быць на вышэйшым футбольным форуме. А вось нарвежцам 10 ачкоў напэўна забракне, каб трапіць у накаўт-раўнд. Там будуць толькі 8 лепшых камандаў з дзевяці, што зойміуць другія месцы (пры падліку вынікі з аўтсайдарамі адкідваюцца).

У Паўднёвай Амерыцы выхад у фінальную стадыю ўжо забяспечылі Бразілія і Парагвай. На астатнія дзве вакансіі прэтэндуюць ажно 6 краінаў, прычым Аргенціна з-за недарэчнага трэнера Дыега Марадоны „завісла" над безданню.

Куды болей, чым нацыянальная зборная, цешыць беларуская моладзевая дружына. Пасля гасцявой вікторыі над Азербайджанам — 3:2 (галы ў нашых забілі Міхаіл Сівакоў, Ігар Карповіч і Дзмітрый Рэкіш), каманда Георгія Кандрацьева выйшла ў лідары — яна мае 6 ачкоў пасля двух паядынкаў. Па столькі ж у Аўстрыі, якая ўзяла верх над Албаніяй — 3:1 і Шатландыі, але яны згулялі на матч болей. Зараз у кастрычніку беларускіх хлопцаў чакае няпростае гасцявое выпрабаванне брытанцамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Што хвалюе кузаўцаў?

Калі хтосьці захоча пацікавіцца кузаўскімі праблемамі, дык рэкамендую зайсці ў вясковую краму. Там пры піўку ўсялякіх навінак паслухаеш. Вось, што зараз хвалюе маіх аднавяскоўцаў.

— У час камасацыі, — гаворыць адзін з пенсіянераў, — геадэзісты вылучылі ўчастак поля за могільнікам на вясковую жвіроўню. Гэтай жвіроўняй карысталіся не толькі кузаўцы, але і многія чарамшане. Пасля арганізавалі тут сметніцу. Па загадзе санэпідэмстанцыі вясковыя сметніцы мясцовы самаўрад ліквідаваў (кузаўцы карыстаюцца паслугамі Гайнаўскага камунальнага прадпрыемства), а сметніцу гміна завозіць пяском, які застаецца непатрэбным з чаромхаўскай дарожнай інвестыцыі. Такім чынам занікае кузаўская жвіроўня. Дзе затым маем капаць жвір для ўласнай патрэбы?

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Што тады з вясковай супольнасцю, якая была вылучана на жвіроўню? І другая праблема з гэтым звязаная. Калі кузаўцы папрасілі гміну ўспамагчы паправіць дарогу на вясковы могільнік, дык гміна адмовілася. Аднасяльчане складаліся па адным мільёне (на старыя грошы) і Мікола Саевіч навазіў жвіру. Можна сказаць, што дарога на могільнік з'яўляецца нашай уласнасцю. Праўда, гміна паслала машыну для выраўнання дарогі, але не для таго, каб зараз аўтамабілі-самазвалы разбівалі яе возячы пясок для засыпвання сметніцы. Гэта крыўдзіць нас!

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

У той жа час я даведаўся яшчэ пра адну праблему.

Пры вясковай краме, якая знаходзіцца насупраць царквы, ёсць незагаспадараная плошча, якая быццам кляймо „кампраметуе" кузаўцаў. Уладальнік крамы ў сваім часе рашыўся добраўпарадкаваць тэрыторыю навокал крамы і паставіць агароджу, але яму не дазволілі, паколькі ён ад ГСу купіў адно краму, а пляц надалей з'яўляецца ўласнасцю вёскі.

У час дажджлівага надвор'я пад'езд да крамы перамяняецца ў раскіслае балота, а тут жа вернікі царквы вымушаны ставіць аўтамабілі. У Чаромсе, напрыклад, гміна арганізавала шыкоўны пад'езд насупраць касцёла пры краме прыватнага прадпрымальніка. Карыстаюцца гэтай дабрадзейнасцю так вернікі касцёла, як і пакупнікі. Усё ж, як адны, так і другія з'яўляюцца падаткаплацельшчыкамі і належыцца ім нешта ад дзяржавы. А мо і чаромхаўскі самаўрад паспрабуе дамовіцца з прадпрымальнікам ад кузаўскай крамы і разам ліквідуюць кузаўскае кляймо паміж царквой і крамай.

(ус)

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

Запіскі са Збуча

Збуч ляжыць пры шашы Гайнаўка — Бельск-Падляшскі. Вёска налічвае 80 дымоў. Частка хат пустуе. У вёсцы няма ні школы, ні крамы — іхныя будынкі стаяць парожнія. Жыхары купляюць прадукты ў аб'язных крамах. Дзяцей адвозяць у зборную школу ў Чыжы. Пасля школы дзеці ўцякаюць у горад з-за недахопу перспектыў жыцця ў вёсцы. Найбольш тут пенсіянераў. Старажыламі з'яўляюцца: спадарыня Сапяжынская (94 гады) ды Пётр Юшкевіч (92 гады) і яго жонка, якой 83 гады. Частка сялян займаецца земляробствам. Трох з іх гадуе кароў — Мікалай Баўтручук, Якуб Міхалюк, Яўген Магрук (ён гадуе таксама гусей). Збожжа вырошчваюць: Яўген Заброцкі (мае ён каля 200 гектараў зямлі; купіў былы кааператыў), Андрэй Бяляўскі (каля 50 га зямлі), Славамір Галёнка (каля 50 га), Аляксей Саўчук (каля 100 га), Юры Заброцкі (каля 200 га). Солтысам з'яўляцца Міхал Саўчук, кавалер — гаспадарыць ён на зямлі разам з бацькам і цешыцца павагай сярод аднавяскоўцаў.

З шырокім размахам вядзе ў Збучы пчалярства дыпламаваны пчаляр Пятро Заброцкі. Ёсць у яго 60 пчаліных сем'яў — на месцы 40, а далей возіць на медазбор 20. Прадае мёд таксама на базарах. Часта ўбачыць можна пчаляра Заброцкага на рыначках у серады і суботы. Якасць мёду ад ягоных пчол лепшая чым у іншых, і прадае яго адносна нядорага.

Агульна можна сказаць, што Збуч — вёска бесканфліктная і спакойная. Ажывае ў фэсты і дажынкі, якія ладзяцца на гарадзішчы.

Андрэй ЯЛОЗА

Нараўчанская гміна

Будзе асяродак для адпачынку над возерам

У Старым Двары ў Нараўчанскай гміне Гайнаўскага павета запланавалі і будуюць асяродак для першнаперш летняга адпачынку, на плошчы сямі гектараў. На беразе Семяноўскага возера будзе вялікі пляж у 8000 квадратных метраў, два сацыяльна-санітарныя будынкі, амфітэатр на тысячу месц, пляцоўкі пад палаткі і для распальвання вогнішчаў, пляцоўка для гульняў для дзяцей. Побач аб'екта адвялі шмат месца для стаянак для аўтамашын ды кемпінгавых прычэп-салонаў.

Сёлета ў палове жніўня закончылі пабудову асфальтавай дарогі з Людвінова ў Стары Двор (раней тут ездзілі па пылістай у сухое лета гравейцы). Яна вядзе са Старога Двара да — з напружаным рухам самаходаў — ваяводскай дарогі н-р 687: з Юшкавага Груда цераз Бандары і Новае Ляўкова ў Нараўку.

(яц)

Небяспечныя павароты

За вёскай Бялкі ў напрамку вёскі Арагоднікі Нарваўскай гміны павятовая жвіровая дарога, але нейкіх 70 метраў за Бялкамі паварот налева на вілах дарог у Сакі — вельмі небяспечны. Тут на абочыне дарогі растуць пустазелле ў рост чалавека ды лаза. Гэты паварот проста сляпы! Другі такі паварот — ва ўрочышчы Дворышчэ каля мастка з бетонных кругоў. Абочына там зарасла густой лазой а каля мастка глыбокія калдобіны. Варта было б адрамантаваць тыя дарогі!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — сербскую прыказку.

1. пясчаны нанос, які перамяшчаецца ветрам = 43 _ 10 _ 13 _ 11 _ 12 _;

2. мілагучная паслядоўнасць гукаў, напеў = 1 _ 31 _ 3 _ 33 _ 5 _ 6 _ 7 _;

3. элемент камп'ютара, які вызначаецца ў байтах = 32 _ 2 _ 34 _ 36 _ 37 _ 38 _;

4. адна з частак вялікага кінафільма, якая дэманструецца самастойна = 24 _ 9 _ 27 _ 28 _ 29 _;

5. вялікая прэснаводная рыба з вусамі = 45 _ 44 _ 39 _;

6. руплівасць, дбайнасць = 16 _ 17 _ 18 _ 19 _ 20 _ 30 _ 8 _ 4 _ 21 __ 14 _ 15 _;

7. зямля, якая ніколі не апрацоўвалася = 46 _ 42 _ 41 _ 47 _ 35 _ 40 _;

8. псеўданім югаслаўскага дзяржаўнага дзеяча Іосіфа Броза (1892-1980) = 22 _ 23 _ 25 _ 26 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 33 нумара

Манашка, стол, партыя, выкрык, лысіна, Арарат, толь, ікс, часць, цяля, ядок, тытан, дзед, Чыкага, Уху, камуніст.

Рашэнне: **Нашы словы крылатыя, толькі часта ляцяць не туды куды хочам.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Мірaслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Фота і тэкст
Ганны КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі (4)

(пачатак у н-ры 35)

Ля бюста-помніка каралю Жыгімонту Аўгусту II укапаная табліца са знакавымі, на думку тутэйшых гісторыкаў, датамі для Ялоўкі. Мяне прыемна здзівіла згадка пра паўстанцаў 1863-64 гадоў. Гэта быў першы і апошні след у справе Кастуся Каліноўскага. Я ўжо раней зразумела, што не магу разлічваць на факты. Дарэчы, усе даследчыкі згодны ў адной справе: Вікенцій Канстанцін Каліноўскі, нават пасля смерці, астаўся ў канспірацыі.

У занатоўцы, паміж векапомнымі падзеямі Ялоўкі, чытаем:

— 1863 год, на Зялёныя Святкі, у Ялоўцы з'явіліся патрызаны Студзеньскага паўстання з Валерым Урублеўскім на чале, тут быў зачытаны Маніфест Нацыянальнага ўраду; у партызанскія рады былі прыняты 100 добраахвотнікаў.

Хрышчэння Кастуся Каліноўскага, ці не самага вядомага ўраджэнца Ялоўскай парафіі, мясцовыя гісторыкі не адзначылі. Затое падзеяй роўнай прызнанню мясціне магдэбурскага права тут палічылі эпідэмію тыфу і халеры (1855-1861 гг.). Пошасць, паводле рэгіянальнай хронікі, успыхнула два гады да прыбыцця паўстанцаў у мястэчка. Чамусьці зноў прыгадаліся тыя медыкі-канспіратары, якія нягледзячы на заразу пайшлі ў канспірацыю змагацца за волю і правы чалавека.

* * *

Пасля 16-й гадзіны ў парк, дзе ў час Каліноўскага быў гарадскі рынак і тут верагодна прачыталі маніфест Нацыянальнага ўрада, пачалі сходзіцца жыхары: цёткі, дзядзькі, два хлопцы, адна дзеўка. Такі зрух у дрымучым мястэчку здаўся быць падазроным. Спачатку здавалася, што, як і я, тыя людзі прыйшлі на аўтобус. Хоць не: для апошняй паездкі не падыходзіла будзённая вопратка местачкоўцаў. У іх вобразе і гутарках, запраўленых гумарам, мне хацелася ўбачыць нашчадкаў паўстанцаў. Магчыма, сярод іх быў хоць адзін праўнук той сотні добраахвотнікаў-партызан, пра якую ўспамінае мясцовая хроніка. Іх продкі, пакуль уступілі ў паўстанцкія рады, мабыць ведалі „Мужыцкую праўду". Можа быць, першую беларускую газету друкавалі ў Ялоўцы. Сярод аўтараў газеты-лістоўкі даследчыкі называюць трох аўтараў: Кастуся Каліноўскага, Валеры Урублеўскага і Фелікса Ражанскага. Апошні з іх праслаўвіўся як аўтар беларускіх песень пра Паўстанне і Кастуся (*Лётае арол лёгкакрылы, па-над хмарамі і туманамі. Ідзе наш змагар Кастусь Каліноўскі сцежкамі, лясамі. Лётае арол шызакрылы пад цёмнымі хмарамі. Ідзе наш Кастусь, змагар наш народны, з сябрамі змарагамі. Шыкуйцеся ж, варожыя каты, шалёныя ваўкалакі. Ідзе беларус, змагар Каліноўскі, сцежкамі, лясамі.*).

На пытанне пра Кастуся Каліноўскага местачкоўцы адразу адаслалі мяне да ксяндза: "On jeden może coś wiedzieć!"

Наколькі візіт у плябаніі нічога не высветліў, я спытала яшчэ пра паўстанцкія песні.

— У нас, з беларусіх песень, спявалі «Кацюшу», — пачула ў адказ.

* * *

У ялоўскім лесе, што шуміць за руінамі касцёла св. Антонія, знаходзіцца яшчэ адзін могільнік. Паводле легенды, там магілы паўстанцаў 1863-64 гадоў, канкрэтна — магільня Багатыровічаў, гэтых самых, якіх апявала ў рамане «Над Нёманам» Эліза Ажэшка. Магіла «слушных» паўстанцаў не захавалася, бо некраполія зарасла лесам пасля другой сусветнай вайны. Апошняя легенда паказалася моцна падазронай. Я раней пабывала на магіле Цэцыліі і Яна Багатыровічаў ля Гродна і шукаць яе ў ялоўскім лесе значыла б сумнявацца ў легенду-матку, прыдуманую пісьменніцай.

Так ці інакш, у Ялоўцы мне пашанцавала высветліць толькі адну справу. У 17 гадзін да грамады, што сабралася на гістарычным рынку, пад'ехалі гандляры-агенты. Заехалі сюды на пяць хвілін, каб купіць ад людзей лісічкі (дзесяць злотых за кілаграм) і чарніцы (пяць злотых за кілаграм). Каб кампенсаваць паразы на журналісцкім грунце, я прапанавала здымак праўнукам і праўнучкам паўстанцаў:

— А то ў інтэрнэце будзе? — спытаў мяне дзядзька, той самы, які раней палічыў «Кацюшу» беларускай песняй.

— У «Ніве»!

— *Япіхумаць!* — у апошнім каментары чулася задавальненне.

(працяг будзе)

19.09 — 25.09

(22.03. — 20.04.) 19 — 21.09. хатнія і прафесійныя абавязкі будуць перашкаджаць адно аднаму. Пастарайся на працы. Сілай волі зможаш змяніць неспрыяльныя акалічнасці. Сябрам давярай, але не слухай іхніх парад у сардэчных справах. Прымяні новую дыету.

(21.04. — 21.05.) Ахопіць цябе любоўнае шаленства! 19 — 23.09. ты проста як магніт! Радасць і аптымізм прагоняць цёмныя хмары. Зможаш зрабіць радыкальныя змены.

(22.05. — 22.06.) 21 — 25.09. нястрашныя табе будуць ніякія турботы, бо знойдзеш з іх геніяльны выхад. Някепска справішся з фінансамі, а ў дробных клопатах памогуць табе суседзі і знаёмыя. Могуць здарыцца неверагодныя прыгоды, але навучышся даваць сабе рады з праблемамі.

(23.06. — 23.07.) Лякарства на паправу сваёй фінансавай сітуацыі знойдзеш у сям'і. (22 — 26.09.) — блізкія падсунуць табе геніяльныя ідэі, якія хутка прыменіш. 19 — 23.09. нават малая правіна на дарозе можна кончыцца для цябе вельмі кепска. Пі крынічную ваду і добра высыпайся.

(24.07. — 23.08.) Хутка ацэніш кожную сітуацыю, твае рашэнні будуць трапныя і разумныя. 18 — 22.09. можаш шмат навучыцца і даведацца пра важныя справы. У апошнюю дэкаду верасня нават найменшая заўвага на твой конт можа вывесці цябе з нерваў.

(24.08. — 23.09.) 21 — 25.09. нават добрыя ідэі прадставіш так хаатычна, што ніхто ў гэтым не разбярэцца. Апошняя дэкада верасня будзе ў цябе пад уплывам Венеры — на ўсе справы глянеш свежым вокам, будзеш сустракацца з вялікім спрыяннем атачэння. Поспехі ўвядуць цябе ў добры настрой (не ўсе гэтым будуць цешыцца!).

(24.09. — 23.10.) Ад 22.09. у тваім знаку будзе панаваць Сонца — будзеш у фантастычным настроі. Досціп, самаўпэўненасць. Пакажаш правадырскія таленты, уразіш іншых. Добры час на падугульненні — з 20.09.

(24.10. — 22.11.) 19 — 23.09. — добрая кан'юнктура ў бізнесе і знакамітыя ходы ў інтарэсах. Немалыя прафесійныя поспехі. Высветляцца праблемы з блізкімі. Саперніка ў пераможаш сардэчнасцю і пачуццём гумару. Хоць поспех будзе мець сваю цану, нічога дарам не дастанеш.

(23.11. — 22.12.) Уражанне, што грошы прападаюць з кашалька. 21 — 25.09. можаш быць расчараваны і сфрустраваны. Спадзяваная змена не наступіць так хутка, як табе здавалася. Але ўвесь месяц сочыць за табою вышэйшая сіла!

(23.12. — 20.01.) Поўна ўражанняў, дынамікі. З лёгкасцю паставіш на сваім. Вельмі творчыя ідэі заляцяць табе ў галаву. Добры момант каб разгарнуць дзейнасць, з'ездзіць у інтарэсах.

(21.01. — 19.02.) Найбольш поспехаў і памысных выпадкаў у Вадалеяў народжаных паміж 4 і 10 лютага. Шыкуйся на імпрэзы, ды не пераборшчвай з алкаголем. Пасля 20.09. фундані сабе прыемнасці і дагаджанне целу. У каханні застой яшчэ аж... да 29 верасня.

(20.02. — 21.03.) Рыбы народжаныя 13 — 18.03. маюць ахвоту на сапраўдную рэвалюцыю! Тое, што ішло блага, удасца. Ды ведаючы, што некаторыя планы зусім не маюць шанцаў, пакінь іх. Не пазычай нікому грошай, плануй свае выдаткі. Папрасі ў лекара накіраванне на абследаванне, добра высыпайся.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960